ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ ЗСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 115 (3223) Пятніца, 24-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЯ НОЧЫ:

МАСКВА, 5. На ранішнім пасяджэньні зьезду Саветаў даклад аб 5-гадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі зрабіў т. Кржыжаноўскі. Даклад слухалі ўсе делегаты і вялікая колькасьць гасьцей

НАВІНЫ В. С. С. Р.

10-гадовы юбілей сьвяткуе сёньня Самарская, імя ангельскага прапетарыяту, кавалерыйская дывізія

25 мая ў Менску будзе падпісаны дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве паміж драждавымі заводамі Масквы, Кіева, Менску і Віцебску

Дзень чырвонага агляду ў Сярэдняй і Паўночнай Нямеччыне

Ва ўсіх гарадох адбываліся магутныя дэманстрацыі

БЭРЛІН, 22. Акрамя гарадоў, аб якіх ужо паведамлялася, — чырвоны агляд адбываўся таксама ў гарадох Сярэдняй Нямеччыне, Турынгіі і ў Паўночнай Нямеччыне. У акрузе Гальле-Мэрзэбург чырвоны агляд быў наладжаны ў 10 гарадох. Пасьля агляду адбываліся дэманстрацыі з удзелам членаў забароненага саюзу франтавікоў. У Брэмене паліцыя напала на разыходзіўшыхся ўдзельнікаў мітынгу і зрабіла некалькі арыштаў. Ва ўсіх пералічаных мясцовасьцях дэманстрацыі былі шматлюднымі. (ТАСС).

Польскі друк падрыхтоўвае грамадзкую думку

ДА ЗАХОПУ ЛІТВЫ

Катастрафічнае становішча ў тэкстыльнай прамысловасьці

ВАРШАВА, 22. Замах на Вальдэмараса паслужыў як-бы сыгналам для часткі польскага друку пэўнага напрамку да жорсткай кампаніі супроць Літвы. Газэты перапоўнены артыкуламі і заметкамі аб становішчы ў Літве. Усе гэтыя артыкулы і заметкі маюць мэтай давесьці, што ў Літве пануе хаос і арэгіі палітычных забойстваў. Сёньня «Кур'ер Чырвоны» падае аб сутычках на польска-літоўскай граніцы паміж групай плечкайцістых і літоўскай пагранічнай вартай. Зацікаўленасьць да польска-літоўскіх адносін узмацняецца ў зьвязку з зацягнуўшымся прабываньнем Пілсудзкага ў Вільне.

Газэты паведамляюць, што Пілсудзкі скончыў ужо ваенную гульню, у якой удзельнічалі былыя вайсковыя начальнікі літоўскага раёну. Пілсудзкі цікавіцца ня толькі становішчам у ваенных часьцях, якія знаходзяцца ў віленскай акрузе, але таксама і дзейнасьцю грамадзянскай адміністрацыі. Так, Пілсудзкі прняў заваду Рачкевіча, які арабіў яму 3-хгадзінны даклад аб становішчы спраў на Віленшчыне.

ТОЛЬКІ 15 ПРОЦ. РАБОЧЫХ У ЛОДЗІ ПРАЦУЮЦЬ ПОЎНЫ ТЫДЗЕНЬ

ВАРШАВА, 23. Дэлегацыя праўленьня пэпэсаўскага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў Лодзі, на чале якой стаіць лодзінскі дэпутат Шчаркоўскі, была прынята міністрам працы палкоўнікам Прыстораам. Дэлегацыя прывяла наступныя весткі аб становішчы рабочых у тэкстыльнай прамысловасьці:

50 проц. рабочых занята толькі 3 дні на тыдзень, толькі 15 проц. рабочых працуюць поўны тыдзень. Многа тысяч рабочых зусім без работы. Больш 40.000 рабочых тэкстыльшчыкаў зарабляюць ад 15 да 20 злотых у тыдзень.

Па словах дэлегацыі крызіс прымае больш шырокі разьмер, чым гэта прадстаўлялася раней. Скарачэньне рабочых працягваецца. Матар'яльнае становішча рабочых катастрафічнае. На глебе голаду і галечы амаль штодзенна здараюцца самагубствы, пакражы і грабяжы. Міністар заявіў, што ён улічвае становішча тэкстыльных рабочых, але тут-жа падкрэсьліў, што стварылася такое цяжкое становішча, якое трудна вырашыць.

***

ВАРШАВА, 23. Пад прадлогам рамонту і пераабсталяваньня зачынена на 2 месяцы буйнейшая тэкстыльная фабрыка Гэйэра ў Лодзі.

ПЕРАД ЗАБАСТОЎКАЮ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ У БЕЛЬСКУ

ВАРШАВА, 22. У тэкстыльнай прамысловасьці ў Бэльску насьпявае канфлікт. Рабочыя патрабуюць павышэньня зарплаты на 10 проц. Прамыслоўцы, карыстаючыся агульным крызісам у тэкстыльнай прамысловасьці, наадварот, імкнуцца зьнізіць заработную плату. Пачаты перагаворы паміж прадпрыемцамі і рабочымі. (ТАСС).

ПРЫГАВАР ПА СПРАВЕ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

МАСКВА, 23. Аб'яднанай Дзяржаўнай Палітычнай Управай (АДПУ) выкрыты контр-рэвалюцыйныя арганізацыі на чыгуначным транспарце і ў золата-плацінавай прамысловасьці Саюзу, якія паставілі сабе мэтаю зьвяржэньне савецкай улады, дапамогу замежнай інтэрвэнцыі і аднаўленьне ў краіне капіталістычнага ладу.

Сваёй мэты яны дамагаліся шляхам шкодніцтва і дэзарганізацыі гэтых галін народнае гаспадаркі. Ідэялёгічнымі натхніцелямі і практычнымі кіраўнікамі ў іх былі: па контр-рэвалюцыйнай арганізацыі на транспарце **фон-Мэк**, былы патомсьцьвены дваранін, былы старшыня праўленьня таварыства прыватнай Маскоўска-Казанскай чыгункі і яе буйнейшы акцыянэр. У апошнія часы—начальнік эканамічнай сэкцыі цэнтральнага плянавага кіраўніцтва НКПШ.

Вялічка—былы патомсьцьвены дваранін, былы начальнік пераводзак па царскай стаўцы. У апошнія часы—член прэзыдыўму Усесаюзнай асацыяцыі інжынэраў і старшыня яе транспартнай сэкцыі, член цэнтральнага камітэту НКПШ па перавозках.

Па контр-рэвалюцыйнай арганізацыі у золата - плацінавай прамысловасьці: **Пальчынскі** — былы таварыш міністра гандлю і прамысловасьці ва ўрадзе Кэрэнскага, былы камэндант абароны Зімняга палацу ў кастрычнікавыя дні 1917 г. У апошні час быў прафэсарам Ленінградзкага горнага інстытуту.

Калегія АДПУ на пасяджэньні сваім ад 22-га мая 1929 году, разглядзеўшы справы вышэйпамянёных арганізацый, пастанавіла:

Фон-Мэка Н. К., Вялічка А. Ф. і Пальчынскага П. А.—як контр-рэвалюцыйных шкоднікаў і няпрымірымых ворагаў савецкай улады—растрэляць. Прыгавор выканан.

Рэшткі ўдзельнікаў паказаных контррэвалюцыйных арганізацый прыгаворана на розныя тэрміны зьняволеньня ў канцлягэры.

Намесьнік старшыні АДПУ ЯГАДА.
Горад Масква, 23 мая 1929 г.

Канфіскацыя камуністычных газэт у Баварыі

БЭРЛІН, 22. Па пастанове Мюнхенскага акруговага суду былі канфіскаваны нядзельныя нумары баварскіх камуністычных газэт «Нэйе Цэйтунг» і «Норд Байрышэ Цэйтунг». У пастанове суду гаворыцца, што канфіскаваныя нумары вьмяшчалі «заклікі да дзяржаўнай здрады і клясавай варожасьці». (ТАСС).

Супроць СССР і Малай Антанты

Італьянска-Вэнгэрска-Польскі блёк

ЗАЛЕСКІ ВЯДЗЕ ПЕРАГАВОРЫ Ў БУДАПЭШЦЕ

ВЕНА, 21. Вэнгэрскі ўрад наладзіў урачысты прыём прыбыўшаму ўчора ў Будапэшт польскаму міністру замежных спраў Залескаму. Адначасова ў Будапэшце знаходзіцца італьянская парляманцкая дэлегацыя на чале з рымскім віцэ-губэрнатарам Анкора. Гэта дэлегацыя прыбыла ў Будапэшт з зьвязку з адкрыцьцем пабудаванай у Будапэшце на італьянскія сродкі калёны ў памяць італьянскіх легіянэраў, загінуўшых у барацьбе за вэнгэрскую рэвалюцыю 1848 году.

З гэтай прычыны ўвесь вэнгэрскі буржуазны друк падкрэсьлівае **значэньне Вэнгрыі для антысавецкага фронту і напамінае, што ў 1920 годзе Вэнгрыя хацела аказаць ваенную дапамогу Польшчы, але, што гэтаму перашкодзіла, галоўным чынам, Малая Антанта.** У яўна інспіраваных заметках друк дае таксама зразумець, што, калі будзе створаны вэнгэрска-італьянскі саюз, дык вострыё тэрытарыяльных патрабаваньняў Вэнгрыі накіруецца, галоўным чынам, супроць Чэха-Славакіі, а з Румыніяй можна будзе ўмовіцца пры дапамозе польскага пасрэдніцтва.

Газэты падкрэсьліваюць, што Залескі прыбыў у Будапэшт у хуткім часе пасьля прабываньня ў Будапэшце італьянскага таварыша міністра замежных спраў Гранды і якраз у момант канфэрэнцыі Малай Антанты ў Белградзе.

«Мадьяршаг» лічыць, што ініцыятарам польска-вэнгэрскага зьбліжэньня, а таксама зьбліжэньня абедзьвюх гэтых краін з Баўгарыяй і Турцыяй пад апекаю Італіі, выяўляецца **Пілсудзкі.** Па словах газэты, саюз з Румыніяй мае значэньне для Польшчы толькі ў тым выпадку, калі Румынія мае ў сябе ва сьпіной добра да яе настроеную, або, прынамсі, нейтральную дзяржаву (маецца на ўвазе Вэнгрыя)».

«Мадьяршаг» заклікае ў зьвязку з гэтым Польшчу ўзяць на сябе ініцыятыву па стварэньні агульнай польска-вэнгэрскай граніцы, а таксама, каб дабіцца спрыяючых адносін Румыніі да мінімальных патрабаваньняў Вэнгрыі.

РЫМ, 21. Вялікую ўвагу ўдзяляе Рым прыезду Залескага ў Будапэшт. Першапачаткова італьянскі друк лічыў, што ўмацаваньне польска-вэнгэрскіх адносін узмоцніць пазыцыі Італіі ў басэйне Дуная. Аднак, сёньня «Карэрэ дэ ляСэра» надае візіту Залескага значэньне манэўру. (ТАСС).

ІНТЭРВ'Ю ЗАЛЕСКАГА КАРЭСПАНДЭНТУ ПАТ

ВЕНА, 22. Вэнгэрскія газэты друкуюць інтэрв'ю, даданае Залескім будапэшткаму карэспандэнту ПАТ. У гэтым інтэрв'ю Залескі кажа, што ён імкнецца пасрэднічаць паміж Румыніяй і Вэнгрыяй, а таксама паміж Францыяй і Вэнгрыяй у мэтах паляпшэньня адносін паміж імі. (ТАСС).

ЯК МЫ РАЗЬБІЛІ БАСМАЧОЎ

Расказ тав. Федзіна

Камісар №-скай кавалерыйскай брыгады т. Федзін расказаў цікавыя падрабязнасьці падзей, якія разгараліся нядаўна ў Таджыкістане, у зьвязку з пераходам басмачамі аўганска-савецкай граніцы.

— Уся банда Максума Фузайлі складалася з 200 чалавек, галоўным чынам, эмігрантаў—таджыкаў і аўганцаў. Першы напад пасьля пераходу граніцы быў зроблен імі на Калай-Хумб, дзе арыстраваўшы і перабіўшы прадстаўнікоў улады, яны пайшлі далей.

Галоўнай мэтай Максума было--арганізаваць насельніцтва і павесьці яго за сабой. Для гэтага ён на скліканых сялянскіх сходах пераконваў сабраўшыхся ў тым, што савецкай улады ўжо няма, што Чырвоная армія даўно расфармавана, а савецкія самалёты, якія паказаліся, Максум выдаваў за ангельскія.

У сваёй агітацыі Максум сустракаў энэргічнае падтрыманьне з боку мясцовых мул і баеў.

Насельніцтва ў сваёй асноўнай масе за ім не пайшло. Былі некаторыя групы, якія далучыліся да яго пад моцным націскам, але і тыя хутка адыйшлі ад яго і разам з рэшткаю працоўнага дэхканства зьявіліся актыўнымі памоцнікамі нашых часьцей у справе прасьледваньня банды Максума. Яны паказвалі шлях сьледваньня шайкі і нават арганізоўвалі баявыя атрады.

Мы атрымалі паведамленьне аб нападзе басмачоў на Гарм. З прычыны таго, што нармальная адпраўка войск з Дзюшамбэ патрабавала вялікай затраты часу, дык мы рашылі абмежавацца пасылкай экстрэнай дапамогі ў Гарм на самалётках. На першым самалёце пляцелі: камандзір брыгады тав. Шашкін, чатыры байцы і я. З сабой мы ўзялі два ручных кулямёты.

З-за адсутнасьці ў Гарме якой-небудзь пасадачнай пляцоўкі, мы зьнізіліся ў 9-ці кілёмэтрах ад гораду. **Даведаўшыся, што горад ужо заняты, мы разьбіліся на дзьве групы і, маючы кожная па кулямёту, кінуліся ў атаку, асыпаючы засеўшых у горадзе бандытаў градам куль.**

Напад цягнуўся нядоўга. Трусьлівыя па натуры, няздольныя да сапраўднага бою басмачы, ня гледзячы на сваю шматлікасьць, не змаглі вытрымаць атакі.

Праз 10-15 хвілін горад быў ачышчаны. Ратуючыся, басмачы накіраваліся з гораду па рацэ Сурхаб. К гэтаму часу ў Гарм былі дастаўлены на 5-ці самалётах дадатковыя атрады нашых байцоў, якія кінуліся прасьледваць уцякаўшых.

Каля кішлака Калай-Лябі-Об, які зьяўляецца бацькаўшчынай Максума, банда была дагнана і разьбіта. Сам Максум быў паранены, але ўцёк разам з рэшткамі банды. Праз два дні шайка была ўноў нагнана і, страціўшы каля 50 чалавек забітымі, коняй і зброю, у шестым парадку ўцякла праз перавал Лісарфаб у Аўганістан.

Узяцьце Гарму для Максума было лёгкай справай з-за адсутнасьці ў горадзе гарнізону. Атрад камсамольцаў, камуністых і працоўных у 23 чалавекі, сабраны арганізаваны, каб сустрэнуць басмачоў, пры ўсёй сваёй адважнасьці, ня змог даць належнага адпору і, страціўшы некалькі чалавек забітымі, вымушаны быў адступіць.

Трэба сказаць некалькі слоў аб мужнасьці нашых байцоў. Калі ў Дзюшамбэ фармаваліся атрады для пасылкі ў Гарм і ўжо прыбыла паведамленьне аб тым, што Гарм больш не адчувае патрэбы ў войсках, да камандаваньня прышла група чырвонаармейцаў таджыкскага батальёну, якая літэральна ўпрашвала пусьціць іх у бой. У часе атакі чырвонаармейцы паказалі сябе надзвычайна адважнымі і добра абвучанымі.

Максум уцёк, пацярпеўшы жорсткае паражэньне пры сваёй першай спробе парушыць спакойнае працоўнае жыцьцё таджыкскага дэхканства. Максум заместа спачуцьця сустрэў злобу і нянавісьць.

Першае выступленьне Максума-добрая навука для ўсяго зарубежнага басмацтва.

Камуністычнае прывітаньне Самарскай, імя Ангельскага пралетарыяту, кавдывізіі

У дзень дзесяцігодзьдзя Самарскай імя Ангельскага пралетарыяту Чырвонасьцяговай кавалерыйскай дывізіі, Менскі Акруговы Камітэт Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі шле шчырае камуністычнае прывітаньне байцам і начскладу дывізіі.

Разам з усёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміяй, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі (бальшавікоў), Самарская дывізія, прайшла славуты шлях узброенай барацьбы і перамог над шматлікімі ворагамі рабочае клясы і працоўнага сялянства за дыктатуру пралетарыяту.

Толькі перамога пралетарыяту над драпежнікамі сусьветнага капіталізму забясьпечыла мажлівасьць рабочай клясе ў цесным саюзе з бедняцка-сераднякімі масмі сялянства пачаць будаваць сваё жыцьцё на сацыялістычных пачатках.

Пралетарыят, у шчыльным саюзе з бедняцка-сераднякімі масамі сялянства, пад умелым кіраўніцтвам камуністычнае партыі, будуе сацыялізм і працуе з посьпехам. Трэба ведаць, што кожны наш посьпех у сацыялістычным будаўніцтве замацоўвае заваёвы Кастрычніка і падрывае ўстоі капіталізму.

Вось чаму так ненавідзяць капіталісты дзяржавы пралетарыяту.

Вось чаму яны пад шум хлусьні аб разбраеньні рыхтуюць супроць нас вайну.

Мы ўпэўнены, што ў будучай барацьбе з капіталістымі мы будзем не адны. Нам дапаможа ў гэтай барацьбе рабочы кляс Захаду і працоўныя Ўсходу. Мы разам з рабочымі Захаду і прыгнечанымі народамі Ўсходу атрымаем перамогу ў апошняй схватцы.

Менскі Акруговы Камітэт ўпэўнены, што ў гэтай рашучай барацьбе, байцы і начскладу славутай Самарскай дывізіі будуць аднымі з першых атрадаў.

МЕНСКІ АКРУГКОМ КП(б)Б.

25-га мая ў клюбе КАРЛА МАРКСА а 6 гадзіне ўвечары адбудзецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ чытачоў газэты «ПРАВДА» г. Менску.

Парадак дня:

1) Справаздача «Правды» (робіць загал. аддз. рабселькораўскага руху рэдакцыі „Правда" тав. Лугонаў).
2) Спрэчкі па справаздачы.
3) Мастацкі канцэрт.

Уваход на канфэрэнцыю па разданых ячэйкамі КП(б)Б білетах.

Пачатак канфэрэнцыі роўна а 6 гадзіне ўвечары, а таму просьба не запазьніцца.

Ячэйкі, якія не атрымалі білетаў, зьвяртаюцца за атрыманьнем іх у Беларускае Аддзяленьне „Праўды" па адрасе: Савецкая № 61.

V Усесаюзны зьезд саветаў

ДАКЛАД тав. РЫКАВА

аб міжнародным становішчы

Дзьве тэндэнцыі буржуазных урадаў

З пачатку свайго дакладу тав. Рыкаў паказвае на тое, што міжнароднае становішча Саюзу ССР характарызуецца дваістасьцю ў нашых адносінах з капіталістычным сьветам. Сярод буржуазных урадаў змагаюцца паміж сабою дзьве тэндэнцыі: адна тэндэнцыя агрэсыўная, якая выяўляе сабой варожыя адносіны да першага ў сьвеце ўраду дыктатуры рабочае клясы і якая мае сваёй мэтай зьнішчэньне пралетарскай дыктатуры, і другая тэндэнцыя, якая дапускае ва ўсякім выпадку ў даных умовах мірнае існаваньне дзьвёх гаспадарчых сыстэм: сыстэмы савецкай і сыстэмы капіталістычнай. Пры такіх умовах палітыка ўраду заключалася ў тым, каб усімі сіламі перамагчы і зьнішчыць актыўнасьць варожых нам сіл і тэндэнцый, імкнучыся да захаваньня міру, як патрэбнай прадпасылкі для будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

СССР барацьбы за мір ня спыніць

Ахарактарызаваўшы далей усе этапы барацьбы за мір, якую вёў урад СССР (дзейнасьць нашай дэлегацыі ў падрыхтоўчай канфэрэнцыі па разбраеньні, падпісаньне пакту Кэлёга, Маскоўскі пратакол), тав. Рыкаў адзначае бязвыніковасьць усіх работ падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні. Разам з гэтым, сказаў тав. Рыкаў,—трэба сказаць, што зусім няўгрунтаванымі зьяўляюцца надзеі тых палітыкаў і літаратараў, якія

****



****

мяркуюць, што пасьля таго, як падрыхтоўчая камісія Лігі Нацый адхіліла савецкія прапановы, мы перастанем змагацца за мір. Наша барацьба за мір, разгортваючыся ўсё больш і больш, будзе з такой-жа актыўнасьцю працягвацца і далей.

Нашы адносіны з Нямеччынай

Гаворачы аб замежнай палітыцы СССР, тав. Рыкаў паказвае, што мы зусім нядаўна з значным посьпехам і выгадай для абодвых бакоў скончылі перагаворы з Нямеччынай і 21-га сьнежня 1928 году падпісалі пратакол, які разьвівае і пашырае схэму гандлёва-эканамічных адносін паміж намі і Нямеччынай, устаноўленую гандлёвым дагаворам 1925 г.

Што датычыць Нямеччыны, дык яна першая ўступіла ў галіне гандлёвых адносін з намі на шлях такога роду фінансавых і крэдытных зьдзелак, якія ў значнай меры палегчылі наш імпарт з Нямеччыны, якія загрузілі заказамі нямецкую прамысловасьць. На практыцы ажыцьцяўленьня гэтага дагавору нямецкія гаспадарчыя колы павінны былі пераканацца ў тым, што ў галіне акуратнасьці мы, калі можна так сказаць, больш акуратныя, чым акуратны немец, і рад плацяжоў зрабілі нават да ўстаноўленага тэрміну. Гэты падыход нямецкіх гаспадарчых колаў адпавядае інтарэсам абодвых бакоў.

У далейшым з Нямеччынай у нас былі розныя непаразуменьні, але яны кожны раз здавальняюча зьнішчаліся. Мы і цяпер ня зусім здаволены тымі адносінамі з боку нямецкай улады да выкрыцьця работы белагвардзейцаў, якія фабрыкавалі ў Бэрліне палітычныя дакументы супроць савецкай улады. Нашы прэтэнзіі тут вынікаюць не з-за простага жаданьня пакараць нейкіх злачынцаў,—яны вынікаюць з нашага жаданьня высьвятліць да канца справу, якая мае міжнароднае значэньне і зьвязана з СССР. Фальшывыя дакументы гэтай і падобных да яе шаек ашуканцаў часамі мелі вялікае значэньне як тэма было з лістом Зіноўева на папярэдніх выбарах у Англіі. Яны ўскладнілі дыплёматычныя адносіны паміж СССР і іншымі дзяржавамі і адбіліся на дзейнасьці сусьветнай дыплёматы. Гэта ня простая арганізацыя ашуканцаў, а гэта палітычная арганізацыя крымінальных ашуканцаў, арганізацыя, якая знаходзіла ўваходы у вельмі знатныя дамы буржуазіі і буржуазнай дыплёматы (аплёдысмэнты).

Усерасійскі зьезд саветаў 1922 году рэкамандаваў Рапальскі дагавор у якасьці ўзору дагаворных адносін паміж савецкай дзяржавай і капіталістычным акружэньнем. Цяпер, амаль праз 8 год нармальных адносін з Нямеччынай мы можам канстатаваць правільнасьць і ўзаемную выгаднасьць асноў, на якіх гэтыя адносіны пабудаваны і на якіх яны павінны разьвівацца і надалей.

Ангельскія цьвёрдалобыя нічому не навучыліся

З Англіяй да гэтага часу дыплёматычныя зносіны не адноўлены. Вам вядома таксама, што разрывам адносін з СССР, кансэрватыўны ўрад не дасягнуў тых мэт, якія ён паставіў перад сабой, ідучы на гэта. Наадварот, аб'ектыўныя даныя гаворадь аб тэй страце, якую атрымалі асноўныя галіны народнае гаспадаркі Англіі, асабліва ангельскі экспартны гандаль, з прычыны адсутнасьці ў працягу 2-х год нармальнай базы для гандлю з намі. Іменна гэтым і тлумачыцца тая здаровая плынь ў радох ангельскае народнае гаспадаркі, якая стаіць на пункце погляду неабходнасьці аднаўленьня нерарваных сувязяй. Іменна гэта плынь выклікала на жыцьця нядаўнюю паездку каля сотні прадстаўнікоў ангельскага дзелавога сьвету ў СССР.

Але і цяпер, ня гледзячы на тое, што такіх яскравых выступленьняў супроць Савецкага Саюзу, як тыя, што мелі месца ў часе папярэдніх выбараў, не наглядаецца, прэм'ер-міністр Бальдвін у сваёй прамове, даводзячы нявыгоднасьць і хісцкасьць адносін з Савецкім Саюзам, заявіў аб тым, што ён ня можа рэкамандаваць разьвіцьця гандлю з Саюзам. Пан Бальдвін у сваёй прамове высунуў новы тэзіс, які да гэтага часу яшчэ нікім з кіраўнікоў кансэрватыўнага ўраду ня высоўваўся.

У працягу двух год кансэрватыўныя дзеячы ўпарта залічылі аб магчымасьці разьвіцьця гандлёвых зносін з СССР без аднаўленьня нармальных дыплёматычных зносін, і не спрачаліся наконт выгаднасьці гандлёвых адносін з СССР. Цяпер кансэрватыўнаму габінэту прыходзіцца даводзіць нявыгаднасьць самога гандлю з СССР. Я ня буду гэта абвяргаць, бо самыя факты з такой навочнасьцю паказваюць адваротнае, што нельга падаць ніводнага выпадку, калі-б гандлёвыя зносіны з намі былі нявыгаднымі для нашых контр-агентаў, або калі нашы арганізацыі парушылі-б узятыя на сябе гандлёвыя абавязацельствы. Разьмеры-ж гандлёвых зьдзелак, зразумела, вызначаюцца юрыдычнымі, прававымі і фінансавымі ўмовамі, якія стварацца для нашага гандлю ў тэй ці іншай краіне.

Што датычыць нашай пазыцыі ў пытаньні аб адносінах да Англіі, дык яна ясна вылажана ў апублікаванай нядаўна заяве прадстаўніка ўрадавай камісіі па перагаворах з ангельскімі прамыслоўцамі тав. Пятакова. Мы лічым, што ёсьць поўная магчымасьць вырашэньня ўсіх спрэчных пытаньняў на базе дагавору з урадам Макдональда 1924 г.

Нашы адносіны з ПАЗШ разьвіваюцца вельмі інтэнсыўна

Другая буйнейшая краіна—ПАЗШ. Адносіны з імі і ў галіне гандлю, і ў галіне вырашэньня такіх пытаньняў, як тэхнічная дапамога разьвіцьцю нашае гаспадаркі, з боку высокае ў тэхнічных адносінах гаспадаркі Амэрыкі, разьвіваюцца вельмі інтэнсыўна. Далейшае разьвіцьцё гэтых адносін, зразумела, натыкнецца на тую перашкоду, што заключэньне буйных гаспадарчых і гандлёвых зьдзелак без магчымасьці дыплёматычнай і юрыдычнай абароны іх будзе для нас ня проста нявыгадай, але вельмі вялікай рызыкай.

Адносіны з Францыяй — на мёртвым пункце

Адносіны з Францыяй застылі на тым пункце, на якім яны былі ў зьрыяд ад'езду Ракоўскага. Пасьля прапаноў, якія былі пераданы Ракоўскім, у выніку работ камісіі па разгляду ўсіх праблем, зьвязаных з даўгамі і крэдытамі, ніякага зруху не адбылося. Мы ня маем адказу, ні на гэтыя прапановы, ні на нашу прапанову аб заключэньні палітычнага дагавору аб узаемным ненападзе. Акрамя таго, палітыка французкага ўраду ў адносінах да нас за апошнія 2 гады налічвае ня мала прыкладаў дзеяньняў і актаў, якія наўрад-ці могуць быць названы актамі, якія выяўляюць гарачае жаданьне ўстанаўленьня добрых адносін.

З Італіяй адносіны разьвіваліся зусім нармальна.

Прыбалтыцкія краіны

Падпісаньне маскоўскага пратаколу, бязумоўна ўнесла значнае аздараўленьне для данага часу ў нашы адносіны з сумежнымі з намі краінамі. Нажаль, у некаторых удзельнікаў маскоўскага пратаколу падобнага-ж імкненьня ў адносінах да СССР не заўважваецца, прынамсі на справе. Досыць спыніцца на апошніх фактах, што мелі месца ў Варшаве.

Зьмягчэньне прыгавору белагвардзейцу Вайцэхоўскаму, які рабіў замах на жыцьцё нашага гандлёвага прадстаўніка ў Польшчы т. Лізарава, абуракчыя па свайму паклёну і беспадонасьці прамовы абаронцаў Вайцэхоўскага, якія ніразу ня былі спынены старшынёю суду, паклёпніцкая кампанія польскага друку супроць СССР,—усе гэтыя даныя сьведчаць аб тым, што новы польскі ўрад выходзіць з глебы маскоўскага пратаколу.

Дэлегаты зьезду слухаюць даклад тав. Рыкава

Мы лічым патрэбным зьвярнуць асаблівую ўвагу грамадзкае думкі абедзьвёх краін на выключную важнасьць устанаўленьня сапраўды, а ня толькі фармальных адносін паміж Польшчай і СССР у інтарэсах як абедзьвёх гэтых краін, так і ў інтарэсах усеагульнага міру.

Мы ня раз заяўлялі—і я гэта зноў пацьвярджаю цяпер—аб нашым сур'ёзным жаданьні дабіцца трывалых мірных адносін і з Польшчай. Мы прапанавалі ёй заключыць пакт аб непападзе, прапанавалі ўжыць самыя сур'ёзныя меры для таго, каб быць спакойнымі адносна межаў, прычым у Польшчы ведаюць, што мы гэта прапануем не з-за нейкай баязьні (усякаму-ж вядома, што калі на нас нападуць і прымусяць біцца, дык мы будзем і ўмеем біцца пасапраўднаму (голас з месц: Правільна. Аплёдысмэнты).

Мы выходзілі і выходзім зараз ва ўсёй нашай палітыцы ў адносінах да Польшчы з таго, што ўмацаваньне мірных адносін выгадна абодвым народам, абедзьвюма дзяржавам.

На днях мы падпісалі мірны дагавор з Эстоніяй. Гэты дагавор павінен і можа адыграць вялікую ролю ў справе ажыўленьня эканамічных сувязяй паміж СССР і Эстоніяй і ўмацаваньня іх палітычных адносін.

Што датычыць Фінляндыі, дык яна да апошняга часу не далучылася да маскоўскага пратаколу, і толькі нядаўна мы атрымалі паведамленьне аб тым, што хаця фармальна яна яшчэ не далучылася да маскоўскага пратаколу, але яна ўжо цяпер сябе лічыць у поўнай ступені зьвязанай гэтым пратаколам. Гэта азначае, што і апошняя сумежная з намі дзяржава ў бліжэйшым будучым далучыцца да яго.

СССР ніколі не пагодзіцца з абураючай акупацыяй Бэсарабіі

Зусім асабняком стаяць нашы адносіны з Румыніяй. Яны стаяць у сувязі з пытаньнем аб Бэсарабіі. У Румыніі спрабавалі вытлумачыць супольнае падпісаньне маскоўскага пратаколу, які гаворыць аб адмаўленьні ад вайны, як сродка нацыянальнай палітыкі, як нашае адмаўленьне аб Бэсарабіі, як нашае прызнаньне правільнай і справядлівай тую абураючую акупацыю, якая цяпер пануе ў Бэсарабіі. Мы адказавалі на гэта, што ў адносінах да Бэсарабіі мы далкам стаім на нашай ранейшай пазыцыі (аплёдысмэнты).

Няхай самі бэсарабцы—тыя, якія жывуць у Бэсарабіі, няхай яны пры дапамозе плебэсцыту вызначаць, з кім яны хочуць жыць,—ці з Румыніяй ці з намі. Мы нічога іншага Румыніі не прапануем, акрамя сумленнага і бесстароннята плебэсцыту, праведзенага ва ўмовах, якія выключалі-б націск як з таго, так і з другога боку, для выяўленьня волі бэсарабскага народу (аплёдысмэнты).

СССР і краіны Сярэдняга і Далёкага Усходу

Нашы адносіны з Японіяй працятваюць разьвіваецца зусім нармальна. Нармальна разьвіваюцца нашы адносіны в Пэрсіяй. Нашы адносіны з Турцыяй выходзяць ня толькі з неабходнасьці ўмацаваньня ўзаемных сувязяй, але і кансалідацыі міру на бліжэйшым Усходзе.

Далучэньне Турцыі да маскоўскага пратаколу было новым выяўленьнем гэтых адносін і супрацоўніцтва ў справе ўмацаваньня міру і разьвіцьця палітычных і эканамічных сувязяй.

Пераходзячы да Аўганістану, я павінен з вялікім жалем канстатаваць, што ўнутраны крызіс, які перажываецца аўганскім народам, ускладнены антаганізмам міжнацыянальнага, міжпляменнага і сацыяльнага парадку, запягваецца. Я павінен таксама зьвярнуць увагу на напружанае становішча, якое стварылася на некаторых вучастках савецка-аўганскай граніцы, сумежных з тэрыторыяй, на якой ліквідаваны органы ўраду Аманулы. Я маю на ўвазе ажыўленьне бандытызму ў гэтых раёнах Аўганістану, адміністрацыя якіх калі і ня мае дачыненьня да фармаваньня і забесьпячэньня банд, дык ва ўсякім выпадку нічога ня ўжывае для недапушчэньня іх пераходу на савецкую тэрыторыю.

Мы працягваем палітыку поўнага няўмяшаньня ва ўнутраныя справы аўганскага народу. Я спадзяюся, што прагрэсыўныя сілы краіны, створаныя 10-гадовым рэжымам аўганскай незалежнасьці перамогуць рэакцыйныя элементы і захаваюць заваяваныя незалежнасьць і уплыў.

Тэндэнцыі і прэтэнзіі Чэха-Славацкага ўраду

З прычыны простага нежаданьня ўраду Чэха-Славакіі паміж намі і гэтай краінай да гэтага часу няма нармальных палітычных адносін. У зьвязку з гэтым, натуральна, не маглі разьвівацца ў выстарчальнай меры і эканамічныя адносіны паміж абедзьвюма краінамі.

Атрыманае гэтымі днямі паведамленьне аб намеры Чэха-Славакіі зьвязаць ня адносіны да СССР з усёй малой Антантай, у тым ліку і з акупуючай Бэсарабію Румыніяй, паказвае на такія тэндэнцыі і прэтэнзіі яе ўраду, якія ня могуць даць ніякай карысьці. Прыведзены ў рух палітычны і фінансава-эканамічны апарат агрэсыўных у адносінах да СССР сіл ня даў тых вынікаў, на якія разьлічвалі іх кіраўнікі. Пляны эканамічнага націску на СССР ня спынілі ні тэмпу, ні аб'ёму нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Пляны стварэньня эканамічнага блёку супроць нас і на гэты раз ня ўдаліся.

За апошні час мы наглядаем цэлы рад зьявішч, якія сьведчаць аб тым, што тэндэнцыя да падтрыманьня мірных эканамічных адносін з намі ўзмацнілася.

СССР усімі сіламі і сродкамі будзе змагацца за мір

З таго, што я вам сказаў, мне здаецца, ясны, папершае той вывад, што элементы агрэсіі супроць нашае дзяржавы, магчымасьць нападу на нашу дзяржаву, бязумоўна, існуюць, але і наша палітыка ў барацьбе за мір і за працяг перадышкі таксама не заўсёды церпіць паражэньне. Наша палітыка ў цэлым павінна і ў далейшым заключацца ў тым, каб змагацца ўсімі сіламі, усімі сродкамі і спосабамі за мір, разьвіваць дзелавыя адносіны з усімі дзяржавамі. З прычыны-ж наяўнасьці агрэсыўных момантаў, з прычыны небясьпекі вайны не забываць аб узмацненьні абароны нашае дзяржавы (шумныя аплёдысмэнты).

Пастанова V Зьезду Саветаў СССР

па справаздачы ўраду Саюзу ССР

ЗЬЕЗД ПОЎНАСЬЦЮ ЎХВАЛІЎ ЗАМЕЖНУЮ І УНУТРАНУЮ ПАЛІТЫКУ УРАДУ СССР

1. V-ты зьезд Саветаў Саюзу ССР, заслухаўшы і абгаварыўшы справаздачу старшыні СНК СССР т. Рыкава аб рабоце ўраду Саюзу ССР за 2 гады, **поўнасьцю ўхваляе замежную і ўнутраную палітыку

V УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

Пастанова зьезду па справаздачы ўраду Саюзу ССР

палітыкі савецкае ўлады і прадугледжае шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, рашучае ўзмацненьне сацыялістычных элемэнтаў ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі, ліквідацыю ўзьнікшых гаспадарчых труднасьцяй, далейшы ўздым матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас, гаспадарчы і культурны ўздым нацрэспублік і адсталых краін, узмацненьне саюзу рабочае клясы з працоўнымі масамі сялянства—тым самым, узмацненьнем палітычных і эканамічных пазыцый савецкае ўлады ў яе барацьбе з клясавымі ворагамі.

6. Зьезд адзначае кіруючую ролю дзяржаўнай сацыялістычнай прамысловасьці ў разьвіцьці народнае гаспадаркі краіны. Сацыялістычная прамысловасьць зьяўляецца базай індустрыялізацыі Саюзу ССР, ад яе разьвіцьця залежыць узмацненьне вытворчае сувязі рабочае клясы з асноўнымі масамі бяднякцкага і серадняцкага сялянства і ўзьняцьце ўсяго гаспадарчага жыцьця Саюзу ССР на больш высокі ўзровень разьвіцьця. Поўнасьцю ўхваляючы палітыку ўраду, накіраваную да максымальнага разьвіцьця вырабу сродкаў вытворчасьці, V-ты зьезд падкрэсьлівае ўсю важнасьць прадпісаных разьвіцьця электрыфікацыі, мэталюргічнае прамысловасьці і машынабудаўніцтва ў тым ліку аўта і трактарабудаўніцтва.

7. V-ты зьезд са здавальненьнем адзначае пералом, дасягнуты сацыялістычнай прамысловасьцю ў справе зьніжэньня сабекошту прамысловай прадукцыі. Разам з тым, зьезд падкрэсьлівае, што далейшае сыстэматычнае зьніжэньне сабекошту застаецца адным з цэнтральных задач гаспадарчага будаўніцтва СССР на бліжэйшае пяцігодзьдзе. Зьніжэньне сабекошту зьяўляецца абсалютна неабходным для плянамернай індустрыялізацыі краіны, павялічэньня ресурсаў капітальнага будаўніцтва, далейшага падвышэньня зарплаты і жыцьцёвага ўзроўню працоўных і ўзмацненьня рабоча-сялянскага саюзу. Сацыялістычная рацыяналізацыя вытворчасьці, увядзеньне новай тэхнікі, узьняцьце прадукцыйнасьці працы і палепшаньне кваліфікацыі і арганізацыі працы—вось мэтады ажыцьцяўленьня буйнейшай важнасьці задачы—зьніжэньня сабекошту. Магутным падважнікам у барацьбе працоўных мас за патаньненьне сабекошту і палепшаньне якасьці прадукцыі, зьезд лічыць разгарненьне зараз сацыялістычнага спаборніцтва. У сувязі з гэтым зьезд прапануе ўраду аказваць ўсямернае падтрыманьне праяўленьню ініцыятывы і самадзейнасьці працоўных у шырокім разгарненьні сацыялістычнага спаборніцтва.

8. Пасьпяховае будаўніцтва сацыялістычнае гаспадаркі і ўзьняцьця дзяржаўнае прамысловасьці на больш высокі тэхнічны ўзровень дало магчымасьць савецкаму ўраду прыступіць да пераводу прамысловых прадпрыемстваў на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Увядзеньне скарочанага рабочага дня ў дзяржпрамысловасьці СССР пры няўхільным палепшаньні матар'яльнага становішча рабочае клясы прадстаўляе сабою буйнейшыя заваёвы працоўных Савецкага Саюзу. Зьезд даручае ўраду СССР з асаблівай уважлівасьцю вывучаць практыку пераходу на 7-гадзінны рабочы дзень у паасобных галінах прамысловасьці з тым, каб было забясьпечана максымальна плянавае і своячасовае ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства ва ўсёй прамысловасьці краіны.

9. V-ты зьезд ухваляе палітыку ўраду ў галіне разьвіцьця сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, палітыку, накіраваную з аднаго боку да стварэньня эканамічнае базы для павышэньня вытворчых сіл бяднякцкіх і серадняцкіх гаспадарак і тым самым, для ўзмацненьня іх пазыцый у барацьбе з кулацкімі элемэнтамі вёскі, а з другога—да максымальнага садзейнічаньня хутчэйшаму каапэраваньню бяднякцкіх і серадняцкіх гаспадарак, аб'яднаньня іх у вытворчыя цэхі—калектывы і да разгортваньня буйных савецкіх гаспадарак—сацыялістычных збожжавых фабрык. Зьезд лічыць, што разьвіцьцё аграмаджаных форм сельгасвытворчасьці вяўляецца важнейшай умовай далейшага росту сельскае гаспадаркі, бо толькі ў буйным аграмаджаным зямляробстве могуць быць ужыты і поўнасьцю ўдасканалены прылады вытворчасьці і навуковыя дасягненьні па арацоўцы зямлі, якія недаступны дробнай індывідуальнай гаспадарцы з прычыны яе адсталасьці і распыленасьці. Канстатуючы, што зараз ужо дасягнуты буйныя посьпехі ў галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі, зьезд адзначае, што галоўнейшым недахопам калгаснага руху зьяўляецца параўнаўча дробныя разьмеры калгасаў. Таму зьезд ставіць перад урадам задачу правядзеньня такой сыстэмы камбінаваных мерапрыемстваў, якая ў максымальнай ступені абясьпечыла-б ня толькі далейшы рост калгасаў, але і ўсямернае іх узмацненьне.

10. Зьезд падкрэсьлівае, што гаспадарчая палітыка ўраду, якая забясьпечвае максымальна-шпаркую індустрыялізацыю краіны, побач са старымі формамі змычкі рабочае клясы і асноўных мас сялянства, стварае новыя формы змычкі па лініі аказаньня ўсё узрастаючай вытворчай дапамогі дзяржавы калектыўным і індывідуальным бяднякцкім і серадняцкім сялянскім гаспадаркам. Гэта вытворчая змычка знаходзіць сваё адлюстраваньне ў павялічэньні сеткі машына-трактарных станцый, трактарных калён і пракатных пунктаў, у разгортваньні будаўніцтва калгасаў і саўгасаў і іншых відаў вытворчага каапэраваньня сялянства і ў пашырэньні забесьпячэньня сялянскіх гаспадарак сельгасмашынамі, прыладамі і мінэральнымі ўгнаеньнямі, у вытворчым накіраваньні сельгаскредыту, у масавай кантрактацыі і г. д.

Разам з мерапрыемствамі агрыкультурнага характару (дасьледчыя станцыі, палепшанае насеннаводзтва, земляўпарадкаваньне і г. д.) усе гэтыя мерапрыемствы даюць магчымасьць значна ўзьняць ураджайнасьць сялянскіх гаспадарак і стварыць усе патрэбныя ўмовы для ўзьняцьця сельскае гаспадаркі на такі ўзровень разьвіцьця, які павінен поўнасьцю забясьпечыць усе патрэбы народнае гаспадаркі, як на лініі ўзмацненьня сельска-гаспадарчай сырцовай базы прамысловасьці, так і па лініі здавальненьня вытворчых патрэб шырокіх працоўных мас. Зьезд поўнасьцю ўхваляе прынятыя ўрадам вымены ў законе аб сельгаспадатку, якія вымяншаюць падатковае абкладаньне серадняка, і закон аб падняцьці ўраджайнасьці, які заахвочвае пашырэньне і разьвіцьцё індывідуальнае бяднякцкае і серадняцкае гаспадаркі.

11. Выходзячы з неабходнасьці пашырэньня буйнейшых эканамічных, тэхнічных і арганізацыйных задач сацыялістычнага будаўніцтва, **V-ты зьезд саветаў Саюзу ССР лічыць абавязковым для ўраду Саюзу ССР зьвярнуць максымальную ўвагу на пытаньні культуры і дабіцца ажыцьцяўленьня важнейшых задач культурнае рэвалюцыі шляхам увядзеньня ўсеагульнага пачатковага абавязковага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці, павышэньня ўзроўню як агульнае, так і прафтэхнічнае асьветы мас, кадру спэцыялістых і навуковых працаўнікоў з людзей рабочае клясы і наогул працоўных мас і прыстасаваньня ўсёй сыстэмы народнае асьветы да задач сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі.**

12. Зьезд ухваляе мерапрыемствы ўраду Саюзу ССР, накіраваныя да ўцягненьня самых шырокіх мас працоўных у справу сацыялістычнага будаўніцтва ў кіраваньні дзяржавай. V-ты зьезд саветаў важнейшымі задачамі ўраду, а таксама ўсіх органаў савецкае улады прызнае правядзеньне няўхільнай барацьбы з бюракратызмам, ажыцьцяўленьне чысткі дзяржаўнага апарату ад чужых савецкай уладзе і злосных бюракратычных элемэнтаў, разгортваньне самакрытыкі з боку самых шырокіх мас рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства, ажыцьцяўленьня саветаў, вылучэньня новых кадраў арганізатараў з радоў рабочых і сялян, а таксама яшчэ больш шырокае ўцягненьне мас у гаспадарчае будаўніцтва праз вытворчыя нарады ў горадзе і вёсцы і г. д.

13. V-ты зьезд з асаблівым здавальненьнем канстатуе, што апошнія выбары ў саветы, у якіх прынялі ўдзел больш 47 мільёнаў выбаршчыкаў, выявілі значны рост актыўнасьці шырокіх мас працоўных гораду і вёскі і яшчэ больш згуртавалі іх вакол мерапрыемстваў савецкае ўлады. Зьезд адзначае, што гэтыя дасягненьні былі ажыцьцёўлены ў значнай меры дзякуючы правадзімай урадам палітыцы на ажыўленьні работы саветаў, па ўзмацненьні нізавога савецкага апарата і ўзмацненьні яго матар'яльнае базы.

Адзначаючы ўсё новыя посьпехі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Саюзу ССР, зьезд лічыць, што далейшае прасоўваньне наперад па шляху да сацыялізму патрабуе перамогі вялізных труднасьцяй, якія стаяць на дарозе сацыялістычнага росту, якія выклікаюцца капіталістычным акружэньнем і вынікаючай адтэтуль неабходнасьцю напружанага тэмпу будаўніцтва, тэхнічнай і культурнай адсталасьці нашай краіны, раздробленасьцю і крайняй адсталасьцю дробных і найдрабнейшых сялянскіх гаспадарак і празьмерным адставаньнем іх разьвіцьця, а таксама вырасшым процідзейнічаньнем сацыялістычнаму будаўніцтву з боку кулацка-нэпманскіх элемэнтаў, з боку клясавага ворага, які злучаецца з бюракратычнымі элемэнтамі дзяржапарату. Зьезд саветаў Саюзу ССР лічыць, што ўсе гэтыя труднасьці могуць быць пераможаны толькі на аснове шпаркага тэмпу індустрыялізацыі краіны, вялізнай актывізацыі пралетарскіх і напаўпралетарскіх мас, пры ўмове пралетарскага краўніцтва сялянствам, згуртаваньня або арганізацыі ўсёй бяднякцка-серадняцкай масы вёскі для барацьбы супроць кулацтва.

Зьезд ставіць у абавязак ураду СССР няўхільна працягваць палітыку шпаркага тэмпу індустрыялізацыі краіны, увядому сельскае гаспадаркі і яе сацыялістычнае рэканструкцыі, перамаганьня ўсялякіх труднасьцяй на гэтым шляху. Зьезд лічыць, што толькі такая палітыка, **якая праводзіцца з усёй напружанасьцю сіл і сродкаў савецкае краіны, зможа забясьпечыць пастаўленую савецкай уладай задачу ў самы кароткі гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах капіталістычныя краіны.**

Старшыня V-га зьезду саветаў Саюзу ССР
М. І. КАЛІНІН.

Сакратар V-га зьезду саветаў Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква, 22 мая 1929 году.

ПРАЦЯГ СПРЭЧАК ПА ДАКЛАДУ тав. РЫКАВА

МАСКВА, 22. На ранішнім пасяджэньні 22 мая адбываліся спрэчкі па дакладу тав. Рыкава. Выступаюць галоўным чынам дэлегаты зьезду—рабочыя, сяляне і прадстаўнікі нацыянальных вобласьцяй і рэспублік. У цэнтры выступленьняў — ацэнка міжнароднай палітыкі ўраду СССР. Усе дэлегаты аднадушна сьцьвярджаюць, што міжнародная палітыка саюзнага ўраду, у аснове якой пакладзена барацьба за мір, зьяўляецца зусім правільнай і атрымлівае поўнае адабраньне з боку мільённых рабоча-сялянскіх мас Саюзу. Рад прамоўцаў спыняецца на гаспадарчых і культурных патрэбах паасобных раёнаў Савецкага Саюзу. Прадстаўнікі Ўзьбэкістану тав. Батэшка і тав. Ахул-Вадаеў гавораць аб патрэбах сталіцы Ўзьбэкістану—Ташкэнта і аб неабходнасьці разьвіцьця бавоўнаводзтва.

Тав. Белікаў, перадаючы прывітаньне зьезду ад рабочых і сялян Уральскай вобласьці, просіць дапамагчы гаспадарчаму будаўніцтву Ўралу. Тав. Коленян, прадстаўнік Арменіі—гавораць аб вялізным гаспадарчым росьце за апошнія гады гэтай рэспублікі; ён прапануе ўзмацніць распрацоўку туфа, які зьяўляецца дасканалым будаўнічым матар'ялам і пемзы, якую СССР зараз увозіць з Італіі.

З вялікай увагай зьезд выслухоўвае прамову старога забойшчыка Данбасу тав. Юба, які расказвае аб адважнасьці данецкіх шахцёраў, гатовых у любы момант абараняць Савецкі Саюз. Дэлегат зьезду, рабочы гораду Баку тав. Сурыгін і дэлегат ад грузінскай рэспублікі т. Тодрыя гавораць аб посьпехах савецкай улады ў галіне нацыянальнай палітыкі. Замест пануючай некалі варожасьці паміж рознымі нацыянальнасьцямі, што насяляюць усходнія раёны СССР, зараз устаноўлены трывалы мір, які садзейнічае ўздыму гаспадаркі і культурнаму разьвіцьцю ў гэтых раёнах.

Спаборніцтва і працоўны ўздым мас

(Прадмова да кніжкі Е. Мікулінай «Спаборніцтва мас»)

Наўрад ці можна сумнявацца, што адным з самых важных фактаў, калі ня самым важным фактам, нашага будаўніцтва зьяўляецца ў даны момант шырока разгорнутае спаборніцтва мільённых мас рабочых. Спаборніцтва цэлых фабрык і заводаў самых рознастайных куткоў нашай вялікай краіны; спаборніцтва паміж рабочымі і сялянамі; спаборніцтва паміж калгасамі і саўгасамі; замацаваньне гэтай масавай вытворчай пераклічкі ў спэцыяльных дагаварох працоўных,—ўсё гэта такія факты, якія не пакідаюць сумненьня ў тым, што сацыялістычнае спаборніцтва мас ужо ўступіла ў моц.

Магутны вытворчы ўздым працоўных мас распачаўся.

Гэта прымушае цяпер прызнаць нават самыя заядлыя скэптыкі.

«Сацыялізм,—гавораць Ленін,—ня толькі ня зьнішчае спаборніцтва, а наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужыць яго сапраўды **шырока**, сапраўды ў **масавым** разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, вывіць таленты, якіх у народзе непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, душыў тысячамі і мільёнамі»...

«Шырокае, сапраўды масавае стварэньне магчымасьці праяўляць прадпрыемнасьць, спаборніцтва і сьмелы пачын зьяўляецца толькі цяпер» ...бо «ўпяршыню пасьля стагодзьдзяў працы на чужых зьяўляецца магчымасьць **работы на сябе**».

«Наша задача цяпер, калі сацыялістычны ўрад мае ўладу—арганізаваць спаборніцтва».

З гэтых палажэньняў Леніна выходзіла XVI канфэрэнцыя ЎсеКП(б), калі яна дала спэцыяльную адозву да рабочых і працоўных аб спаборніцтве.

Некаторыя «таварышы» з бюракратаў думаюць, што спаборніцтва ёсьць чарговая мода бальшавікоў і, як такая, павінна заглухнуць па скалчэньні «сэзону». «Таварышы» з бюракратаў, зразумела памыляюцца. Сапраўды-ж спаборніцтва ёсьць **камуністычны мэтад будаўніцтва сацыялізму** на аснове максымальнай актыўнасьці мільённых мас працоўных. Сапраўды-ж спаборніцтва ёсьць **той падважнік**, пры дапамозе якога рабочая кляса заклікана перавярнуць усё гаспадарчае і культурнае жыцьцё краіны на базе сацыялізму.

Другія «таварышы» з бюракратаў, будучы напалоханы магутнай хваляй спаборніцтва, спрабуюць стварыць для яго штучныя рамкі, уварнаць яго ў берагі, «цэнтралізаваць» справу спаборніцтва, звузіць яго размах і пазбавіць яго, такім чынам, самага важнага ў ім—**ініцыятывы** мас. Няма чаго і гаварыць, што разьлікі бюракратаў не апраўдаюцца. Ва ўсякім выпадку партыя прыме ўсе меры да таго, каб нератварыць іх у грэскі. Сацыялістычнае спаборніцтва ня ёсьць канцылярская справа. Сацыялістычнае спаборніцтва ёсьць выяўленьне дзелавой рэвалюцыйнай **самакрытыкі** мас, якая апіраецца на творчую **ініцыятыву** мільёнаў працоўных. Усякі. хто ўціскае, сьвядома або несьвядома, гэтую самакрытыку і гэтую творчую ініцыятыву мас, павінен быць адкінуты вон з дарогі, як тормаз нашае вялікае справы.

Небясьпека бюракратызму выяўляецца канкрэтна, перш за ўсё, ў тым, што ён зьвязвае энэргію, ініцыятыву і самадзейнасьць мас, ён трымае пад спудам вялічэзныя рэзэрвы, якія тоўцца ў нэтрах нашага ладу, у нэтрах рабочае клясы і сялянства, ён не дае скарыстаць гэтыя рэзэрвы ў барацьбе з нашымі клясавымі ворагамі. Задача сацыялістычнага спаборніцтва заключаецца ў тым, каб разьбіць гэтыя бюракратычныя путы, адкрыць шырокае поле для разгортваньня энэргіі і творчай ініцыятывы мас, вывіць вялічэзныя рэзэрвы, што тоўцца ў нэтрах нашага ладу, і кінуць іх на шальку вагі ў барацьбе з нашымі клясавымі ворагамі як унутры, так і па-за нашай краінай.

Часамі сацыялістычнае спаборніцтва блытаюць з канкурэнцыяй. Гэта вялікая памылка. Сацыялістычнае спаборніцтва і канкурэнцыя ёсьць два зусім розныя прынцыпы. Прынцып канкурэнцыі: **паражэньне і сьмерць адных**, перамога і панаваньне другіх. Прынцып сацыялістычнага спаборніцтва: таварыская **дапамога** адсталым з боку перадавых з тым, каб дабіцца **агульнага ўздыму**. Канкурэнцыя гавораць: дабівай адсталых, каб умацаваць сваё панаваньне. Сацыялістычнае спаборніцтва кажа: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція—лепш,—**даганяй лепшых** і дабіся **агульнага ўздыму**. Гэтым, уласна, і тлумачыцца той нябывалы вытворчы энтузіязм, які ахапіў мільённыя масы працоўных у выніку сацыялістычнага спаборніцтва. Няма чаго і гаварыць, што канкурэнцыя ніколі ня можа выклікаць чаго-небудзь падобнага да гэтага энтузіязму мас

У апошні час пачасьціліся ў нашым друку артыкулы і заметкі аб спаборніцтве. Пішуць аб філёзофіі спаборніцтва, аб карэньнях спаборніцтва, аб магчымых выніках спаборніцтва і г. д. Але рэдка можна спаткаць такія заметкі, якія выяўлялі-б колькі-небудзь зьвязна малюнак таго, **як** праводзіцца спаборніцтва **самімі масамі**, малюнак таго, **што перажываюць** мільённыя масы рабочых, ажыцьцяўляючы спаборніцтва і надпісваючы дагавары, малюнак таго, што масы рабочых лічаць справу спаборніцтва **сваёй упаснай, роднай справай.** А між тым, гэты бок справы прадстаўляе для нас надзвычайна важны бок спаборніцтва.

Я думаю, што брашура тав Е. Мікулінай зьяўляецца першай спробай даць зьвязнае вылажэньне матар'ялаў з **практыкі** спаборніцтва, якое дэманструе справу спаборніцтва, як справу саміх працоўных мас. Каштоўнасьць гэтай брашуры ў тым, што яна прадстаўляе просты і праўдзівы расказ аб тых глыбінных працэсах вялікага працоўнага ўздыму, якія складаюць унутраную спружыну сацыялістычнага спаборніцтва.

І. СТАЛІН.

ЗЬВЯЗДА

Партыйнае будаўніцтва

За генэральную лінію партыі

Супроць антыленінскай ідэалёгіі правых

Заводзкія парт'ячэйкі аднадушна ўхваляюць пастановы XVI партканфэрэнцыі

Усе сілы на ажыцьцяўленьне пяцігодкі

(Парт'ячэйка Эльводу, Менск)

Заслухаўшы даклад тав. Цэнцыпэра аб выніках XVI партканфэрэнцыі, адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б **Эльводу** цалкам ухваляе пастановы канфэрэнцыі, накіраваныя на ўзмацненьне тэмпу індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Сход вітае пастановы канфэрэнцыі аб неабходнасьці самай рашучай барацьбы з правымі і прымірэнцамі. Кожны камуністы ў сваёй штодзённай рабоце павінен сыстэматычна выкрываць апартуністычную сутнасьць правага ўхілу.

Чыстка і праверка радоў партыі, чыстка савецкага апарату зьяўляюцца неабходнымі мерапрыемствамі, якія забясьпечаць далейшыя посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Рэалізацыя пяцігодовага гаспадарчага пляну патрабуе вялікага напружаньня сіл усёй партыі і рабочае клясы.

Навукола гэтай задачы павінна быць мабілізавана ўся наша ўвага. Трэба шырока папулярызаваць задачы пяцігодкі сярод працоўных мас гораду і вёскі.

Ні на мінуту не паслабляць барацьбы з правымі і прымірэнцамі

Гэтымі днямі адбыўся адкрыты сход парткалектыву заводу «Камунар». На сходзе з дакладам аб выніках XVI партканфэрэнцыі выступіў тав. Гурэвіч.

Ва ўхваленай рэзалюцыі сход аднадушна далучыўся да ўсіх пастаноў XVI партканфэрэнцыі і рашуча асудзіў правы ўхіл і прымірэнцтва да яго.

—Ні на мінуту не аслабляць барацьбы з правымі і прымірэнцамі—заявілі ў сваёй рэзалюцыі камуністы з заводу «Камунар». Сход далучыўся да рэзалюцыі Менскага актыву па дакладу тав. Гамарніка.

Больш увагі бальшавіцкаму выхаваньню новага партыйнага папаўненьня

Шырэй уцягнем нанава прынятых партыйцаў у штодзённую партыйную і грамадзкую работу

Узброім іх ленінскай непрымірымасьцю да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі

Палітычнае выхаваньне кадраў маладых партыйцаў вяўляецца баявой задачай усёй партыі. У сучасны момант гэта задача мае асабліва вялікае практычнае значэньне.

У рады партыі ўвесь час уліваюцца сотні і тысячы перадавых пралетараў. Вярбоўка ў партыю лепшых беспартыйных рабочых, батракоў і с.-г. рабочых на бліжэйшыя гады павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсіх партарганізацый. Гэтых камуністых трэба будзе выхаваць, узброіць іх ленінскай тэорыяй, зрабіць іх сучаснымі бальшавікамі.

Выходзячы з гэтай асноўнай задачы, XII зьезд КП(б)Б прызнаў неабходным **забясьпечыць выхаваньне праз партыйна-палітычную асьвету ўсіх рабочых, батракоў і с.-г. рабочых, што прымаюцца ў партыю.**

Кожная партыйная арганізацыя павінна шырока разгарнуць работу сярод новых партыйцаў, усямерна садзейнічаць узьняцьцю іх ідэёва-палітычнага ўзроўню, уцягваць іх у практычную партыйную і грамадзкую работу. Між тым, на справе рад арганізацый зусім ня ўлічвае ўсёй складанасьці і важнасьці гэтай работы. Так, напрыклад, некаторыя ячэйкі зусім не праводзілі ніякай работы сярод партыйцаў ленінскага і кастрычнікавага заклікаў. Асноўным недахопам у рабоце з новым партыйным папаўненьнем зьяўляецца адсутнасьць правільнага падыходу да гэтых таварышоў. Часта правадзімая арганізацыйная і партыйна-выхаваўчая работа не адпавядае палітычнаму і культурнаму ўзроўню новых кадраў. Гэта, у асобных выпадках, цягне за сабой выхад кандыдатаў з партыі, або мэханічную пратэрміноўку кандыдацкага стажу. Такія факты паўтарацца не павінны. Маладыя партыйцы як на прадпрыемстве, так і ў вёсцы павінны быць поўнасьцю ахоплены палітычнай і ўцягнуты ў штодзённую работу парт'ячэек. Каб гэта ажыцьцявіць, трэба чула і асьцярожна падыходзіць да агульна-палітычнага і культурнага разьвіцьця кожнага асобнага таварыша, улічваць сацыяльна-бытавыя ўмовы, у якіх ён знаходзіцца. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на пытаньні правільнага рэгуляваньня партнагрузкі кандыдатаў. Нельга дапушчаць таго, каб нанава ўступіўшы ў партыю рабочы ня меў ніякай нагрузкі. Кожны новы партыец павінен выконваць тую або іншую партыйную ці грамадзкую работу. Аднак, у даным выпадку неабходна напярэдадзіць супроць мэханічнага няправільнага падыходу да разьмеркаваньня нагрузак. Нельга перагружаць, трэба ўлічваць жаданьні і здольнасьці новых таварышоў. Трэба весьці пастаянны ўлік партыйна-грамадзкай нагрузкі кандыдатаў—гэта дапаможа правільнаму разьмеркаваньню гэтай нагрузкі сярод нанава прынятых.

На мясцох з боку ячэек і асобных партыйцаў часта бываюць няўважлівыя, нетаварыскія адносіны да рабочых, нядаўна прынятых у партыю. Прадастаўленыя самі сабе кандыдаты ні адкуль не атрымліваюць практычнай дапамогі ў выкананьні сваіх нагрузак.

Нанава прынятыя ў партыю таварышы павінны быць добра знаёмы з пастановамі 15-га зьезду ЎсеКП(б), 12-га зьезду КП(б)Б, наступных пленумаў ЦК ЎсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і XVI партканфэрэнцыі. Пры гэтым трэба зьвярнуць увагу на тое, каб гэтыя партыйцы цьвёрда ўсьвядомілі неабходнасьць барацьбы з правымі і прымірэнцамі, неабходнасьць вывучэньня сацыяльна-эканамічных карэньняў правага ўхілу і рашучага выкрыцьця апартуністычнай сутнасьці гэтага ўхілу. Партпалітвучоба павінна быць цесна ўвязана з інтэрнацыянальным выхаваньнем новых таварышоў. Да гэтага часу практыкавалася ўключэньне нанава прынятых у партыю рабочых у лік слухачоў палітшкол у сярэдзіне навучальнага году. Гэта, зразумела, няправільна. Для гэтых партыйцаў трэба арганізаваць спэцыяльныя школы або гурткі. Ва ўмовах вёскі на летні пэрыяд асноўнай формай палітвучобы павінны застацца гурткі бягучай палітыкі.

Такія-ж гурткі трэба арганізаваць пры саўгасах і калгасах. У работу гэтых гурткоў павінны быць уцягнуты беспартыйныя саўгаскія рабочыя, батракі і калгаснікі.

Трэба прывучыць партыйцаў-навічкоў да самастойнай чыткі газэт, рэкамэндаваць ім найбольш каштоўныя і карысныя артыкулы. Разам з гэтым трэба зьвярнуць сур'ёзную увагу на ўзьняцьце агульна-асьветнага ўзроўню кандыдатаў. З работніцамі і батрачкамі, прынятымі ў партыю, трэба павесьці асобна глыбокую партыйна-выхаваўчую, агульна-асьветную работу.

Б. МАР'ЯНАЎ.

Партарганізацыі часьцей ВВА напярэдадні генэральнай праверкі сваіх радоў

Да чысткі падрыхтаваны

(Арганізацыя КП(б)Б №-скай беларускай дывізіі)

У бліжэйшыя дні пачнецца праверка і чыстка партарганізацыі **№-скай беларускай дывізіі.**

У гутарцы з нашым супрацоўнікам сакратар дывізійнай парткамісіі тав. **Шаўцоў** паведаміў аб падрыхтоўцы да праверкі і аб парадку, у якім яна будзе праводзіцца.

Уся падрыхтоўчая работа да праверкі і чысткі нашай партарганізацыі,—кажа тав. Шаўцоў,—скончана. Характарыстыкі на ячэйкі і палкавыя калектывы ўжо складзены і шырока абгаворваны на агульных сходах.

Партыйцы і беспартыйныя чырвонаармейцы прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўчай рабоце.

У сучасны момант ячэйкі прапрацоўваюць інструкцыю ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі і папулярызуюць яе сярод беспартыйнай масы чырвонаармейцаў.

Па ўсіх казармах вывешаны скрынкі для заяў і матар'ялаў для праверачных камісій.

Усяго па дывізійнай партарганізацыі будуць адначасова працаваць тры праверачныя камісіі. Ужо намечаны першыя тры парткалектывы, з якіх пачнецца праверка і чыстка. Гэта—ячэйка штабу дывізіі, партыйны калектыў №-скага стралковага палка і парткалектыў №-скага артылерыйскага палка.

Уся работа па праверцы і чыстцы будзе праводзіцца ў лягерах, куды спэцыяльна выедуць праверачныя камісіі.

У тэрытарыяльных палках праверка і чыстка будзе праводзіцца толькі сярод камуністых са сталага складу.

Кандыдатуры ў праверачныя камісіі абгаворваны на сходах ячэек і парткалектываў і ў бліжэйшыя дні склад праверкомаў будзе зацьверджаны адпаведнымі партыйнымі органамі.

Г—с.

Арганізацыя КП(б)Б №-скай кавалерыйскай дывізіі

Сакратар парткамісіі № кавалерыйскае дывізіі **т. Новікаў** паведаміў наступнае:

Па партарганізацыі нашае дывізіі будуць працаваць **4 праверачныя камісіі.**

У першую чаргу праверку і чыстку пройдуць ячэйкі: **конна-артылерыйскага дывізіёну, броня-дывізіёну, корпуснага эскадрону сувязі, штабу дывізіі і часьцей Барысаўскага гарнізону.**

Потым будуць правярацца партарганізацыі асноўных часьцей дывізіі (палкавыя парткалектывы, ячэйкі паасобных эскадронаў).

Праверкомы будуць працаваць у лягерах, па месцы знаходжаньня часьцей.

Уся падрыхтоўчая работа да праверкі і чысткі партыі **закончана.** Характарыстыкі на ячэйкі і палкавыя парткалектывы абгаворваны на агульных сходах партыйцаў з шырокім прыцягненьнем беспартыйных. Зараз ячэйкі прапрацоўваюць інструкцыю ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі.

Рэдакцыйныя калегіі насьценгазэт вайсковых часьцей актыўна рыхтуюцца да асьвятленьня ходу праверкі і чысткі. Будуць выпускацца спэцыяльныя «ільлічоўкі-шматтыражкі», прысьвечаныя чыстцы.

У казармах праводзіцца вялікая растлумачальная работа сярод чырвонаармейцаў. Разьвешаны скрынкі для матар'ялаў для праверкомаў.

С.

Партвучоба ў барысаўскай арганізацыі КП(б)Б

Партыйныя школы **Барысаўскай** арганізацыі КП(б)Б скончылі сваю работу. Зараз арганізацыя падагульвае напярэднія вынікі зімовай партпалітвучобы. Гэтыя вынікі сьведчаць аб тым, што зімовая вучоба прайшла нездавальняюча.

СУМНЫЯ ЛІЧБЫ

У пачатку навучальнага году ўся арганізацыя была ахвачана палітвучобай. У партшколы запісалася сотні беспартыйных рабочых і работніц. Так, напрыклад, у адзінай палітшколе займалася каля 200 беспартыйных рабочых. Аднак, да канца вучобы колькасьць слухачоў скарацілася амаль у два разы. У цэлым радзе партшкол процант адсеву слухачоў даходзіць да 50. У 19 групах адзінай школы ў першыя месяцы вучобы займалася каля 1.000 чалавек. Потым гэта лічба значна зьменшылася. З усіх беспартыйных рабочых, што займаліся ў гэтых групах, выйшла 60 проц. Палова камуністых слухачоў адзінай школы да канца году спыніла наведваньне заняткаў. Гэта вялікая цякучасьць складу слухачоў зьяўляецца асноўным недахватам партвучобы.

ПРЫЧЫНЫ

Парт'ячэйкі зусім невыстарчальна цікавіліся пытаньнямі партыйнае асьветы. Арганізацыйнае правядзеньне партвучобы было пастаўлена нездавальняюча.

На заводзе імя **Домбаля** ўсе зьменныя палітгрупы былі злучаны ў адну школу. Такім чынам, палітвучоба была зусім не прыстасавана да ўмоў работы на заводзе. Школа не магла разгарнуць сваёй работы. Дзённыя і начныя рабочыя не маглі ў той-жа час прыходзіць на заняткі. Партшколы на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** ня маюць адпаведнага памяшканьня для правядзеньня заняткаў. Гэта зрывае палітвучобу. Нярэдка кіраўніком школ прыходзілася бегаць па ўсёй фабрыцы і шукаць якое-небудзь вольнае адпаведнае памяшканьне. На гэта траціўся шмат часу. Прыблізна ў такім-жа становішчы знаходзяцца партшколы і на іншых прадпрыемствах.

Праграмы пізаных партшкол не здавальнялі слухачоў. Гэта было адзначана канфэрэнцыяй слухачоў і кіраўнікоў гэтых школ. У большасьці праграмы вельмі складаныя, мала папулярныя, недаступныя радавым партыйцам і беспартыйным рабочым.

Школы ня мелі добрых навучальных падручнікаў, што таксама адбілася на якасьці палітвучобы.

Работа партшкол да гэтага часу ня ўвязана з практычным жыцьцём прадпрыемстваў. Так, міма ўвагі партшкол прайшлі такія пытаньні, як перавыбары саветаў, абгляд вытворчых нарад, перавыбары ЦРК і г. д. У асноўным гэта тлумачыцца тым, што большасьць прапагандыстых не падтрымлівалі сталай сувязі з заводамі і фабрыкамі. Склад кіраўнікоў партшкол слаба падрыхтаваны.

Нярэдка на запытаньні слухачоў кіраўнікі давалі няправільныя адказы.

Вось асноўныя прычыны нездавальняючага балянсу зімовае партасьветы.

У ЧАСЕ ЛЕТНІЯ ПАЛІТВУЧОБЫ ВЫПРАВІЦЬ НЕДАХВАТЫ

Усе гэтыя недахваты павінны быць выпраўлены ў часе разгортваньня летняй партпалітвучобы.

Разам з гэтым Барысаўская партарганізацыя павінна своячасова падрыхтавацца да новага навучальнага году. У прыватнасьці трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку сталых прапагандыстых і кіраўнікоў партшкол. Толькі пры ўмовах своячасовай і добрай падрыхтоўкі, памылкі і недахваты гэтага году будуць зьнішчаны.

М. Ш.

Калгасы падрыхтаваліся да сяўбы

ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ СРОДКАМІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

У сучасны момант на Беларусі веснавая сяўба ў поўным разгары. Як-жа падрыхтаваліся да сяўбы калектыўныя гаспадаркі. Крэдытамі і сродкамі вытворчасьці калгасы забясьпечаны амаль што поўнасьцю. Калгасы атрымалі патрэбную колькасьць насеньня за выключэньнем лубіну і вікі, якіх не хапае па ўсіх акругах БССР.

Апрача таго, у некаторых акругах, напрыклад, Магілеўскай і Менскай, не хапіла насеньня канюшыны, а ў Аршанскай—пшаніцы і бульбы.

Мінэральнымі ўгнаеньнямі калгасы таксама ня ўсюды былі забясьпечаны, адчуваўся недахват угнаеньня па калгасах Магілеўшчыны, Меншчыны, Аршаншчыны і Бабруйшчыны.

Ачыстка насеньня ў калгасах праведзена поўнасьцю. Апрача таго, машынамі калгасы ачышчана каля 100.000 пуд. сялянскага насеньня. Фармалінам для пратруч

Сёньня Самарская, імя Ангельскага пралетарыяту, кавдывізія сьвяткуе свой 10-цігадовы юбілей

АКТЫЎНАЯ ЎДЗЕЛЬНІЦА КЛЯСАВЫХ БОЕК, ВЫХАВАЛЬНІЦА НОВЫХ КАДРАЎ БУДАЎНІКОЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВЁСКІ, АДДАНАЯ СПРАВЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ САМАРСКАЯ ДЫВІЗІЯ І НАДАЛЕЙ БУДЗЕ СТАЯЦЬ НА ВАРЦЕ СССР І САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Наша бальшавіцкае прывітаньне чырвоным кавалерыстым Самарскай дывізіі!

СЛАЎНЫ ШЛЯХ

Рабочая кляса праявіла ў грамадзянскай вайне ня толькі вялікі гэраізм, але і вялізную творчасьць у арганізацыі сваіх узброеных сіл. Калі баявая абстаноўка патрабавала стварэньня Чырвонае коньніцы, рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў самы разгар грамадзянскай вайны, у самых цяжкіх умовах, з надавычайнай хуткасьцю стварыла свае пралетарскія палкі, дывізіі, карпусы і нават цэлыя армії чырвонае коньніцы.

Самарская кавалерыйская дывізія імя ангельскага пралетарыяту створана ў гэтых умовах, у агні грамадзянскае вайны. Яна ўвесь свой шлях прайшла, як актыўная ўдзельніца клясавых боек, як верная і шчыра адданая справе пралетарскае рэвалюцыі частка Чырвонае армії.

Самарская кавдывізія сфармавана пад Астраханьню ў красавіку-маі 1919 г. Яна была арганізавана з атрадаў Чырвонае армії, якія змагаліся з белымі на Каўказе і потым пад націскам вялізных зграй белагвардзейцаў прымушаных адступаць праз кіргіскія стэпы, Астрахань-Касьпійскую пустыню да Астрахані. Гэта быў вялікі паход, гэраічнае адступленьне, якое цягнулася 25 дзён. Байцы адступалі ня толькі пад націскам ворага, але пад націскам холаду, голаду і тыфусу. Гэты пераход каштаваў вялікіх ахвяр, шмат чырвоных байцоў засталося назаўсёды ў пясках.

Адступленьне і ахвяры не зламалі баявога духу байцоў, іх рэвалюцыйнай рашучасьці і клясавай нянавісьці да ворага. З тых, што засталіся жывымі, загартаваных байцоў, удзельнікаў гэтага вялікага паходу і былі сфармаваны першыя палкі Самарскае кавалерыйскае дывізіі.

У першыя-ж дні свайго сфармаваньня, дывізія прыняла баявое хрышчэньне ва ўпартых баёх пад Астраханьню, праявіўшы сябе, як смелая і адважная часьць. Так, напрыклад, пад сялом Алінчава 19-га чэрвеня на вучастку 37 кав. палка прарвалі фронт тры палкі белай кав. дывізіі генэрала Бабіева. Белая коньніца, якая падтрымлівалася пяхотаю і 6 гарматамі, стала акружаць 37 кав. полк. Аднак, 37 кав. полк не спалохаўся, а перайшоў сам у контратаку і, праяўляючы надзвычайна ўмеламу і спакойнаму кіраўніцтву камандзіра палка Абрамёнка і выключнай адважнасьці байцоў, 37 кав. полк ня толькі вырваўся з акружэньня, але, ідучы за часьцямі праціўніка, прымусіў белую коньніцу пусьціць наўцёкі, забраўшы ў палон 150 салдат, 8 афіцэраў, 4 кулямёты і шмат рознае вайсковае амуніцыі.

За гэту аперацыю ЦВК РСФСР узнагародзіў 37 кав. полк ганаровым рэвалюцыйным чырвоным сьцягам.

25 чэрвеня 1919 г. праціўнік сілаю каля 3-х кав. палкоў пры 2-х гарматах



Тав. БАЧАРАЎ—камісар Самарскай кавдывізіі

начаў адзываць галоўныя сілы чырвоных ад Астрахані, стараючы гэтым паразоу ўсяму Астраханскаму вучастку. У сувязі з гэтым 38 кав. палку было загадана спыніць гэта наступленьне праціўніка, які ўжо быў блізкі да захвату дарогі, што вяла з Васінскай на Лінейнае —Астрахань і злучала галоўныя сілы з Астраханьню.

38 кав. полк, ня гледзячы на вялікую перавагу сіл праціўніка, кінуўся ў контр-атаку, у выніку якое праціўнік быў ня толькі спынен у сваім наступленьні, але і адкінуты на 4-5 вёрст ад дарогі з вялікімі для яго стратамі, чым была ліквідавана пагроза абходу і адрэзу нашых галоўных сіл. За гэту адважную контр-атаку 38 кав. полк таксама ўзнагароджан ЦВК РСФСР ганаровым рэвалюцыйным чырвоным сьцягам.

Пасьля Астраханскіх баёў дывізія доўга білася з белагвардзейцамі, бароначы Царыцын, праяўляючы там вялікую стойкасьць і адважнасьць. Асабліва моцна і ўпарта дывізіі прыходзілася ваяваць у Самарскай губэрні. На Самарскую губэрню пад Дутаўскімі сьцягамі наступалі шматлікія белагвардзейска-кулацкія сібірскія атрады. Для абароны Самарскае губэрні і ўтрыманьня Самарскага баявога вучастку была кінута наша дывізія. Не пашанцавала белагвардзейцам. У крывапралітным, цяжкім баі ля Жыткур Дутаўская зграя была зусім разьбіта. За выключна ўдалыя баі і адважную абарону Самарскае губэрні РВС рэспублікі надаў нашай дывізіі назву Самарскай.

Дывізія прымала актыўны ўдзел у разгроме і ліквідацыі Дзянікінскае армії, у прыватнасьці, дывізіяй былі ўзяты Сталінград, дзе захоплена 5 тысяч палонных і вялізныя трафеі, Кізьляр і Бераўляньк з гарнізонам войска і вялізнай колькасьцю трафеяў.

Наступіла перадышка, адпачынак, але не на доўга. Зноў баі і паходы. Прышлося біцца з бэка-жанскімі бандамі Азэрбайджану. А ўлетку 1920 году прышлося ісьці на Ўрангеля. У самым пачатку барацьбы з Урангелем, дывізія ўпяршыню пацярпела няўдачу, урангелеўская коньніца, якая пераважала нас па колькасьці, напала на частку дывізіі і захапіла 6 нашых гармат. Бываюць і няўдачы, на вайне бяз гэтага не абыйдзешся Але за гэту няўдачу дывізія дорага адплаціла ўрангелеўцам, бязьлітасна зьнішчаючы іх. На ўрангелеўскім фронце дывізія ўзяла вялізную колькасьць палонных, трафеяў і шмат населеных пунктаў. Дывізія прымала актыўны ўдзел у вядомай Сіваскай аперацыі і ў ачышчэньні Крыму. Апошні баявы этап дывізіі—барацьба з Махноўшчынай і яе водпускамі—бандамі Шчуся, Залатога Зуба, а таксама з Цюцюнькам. Гэта была вельмі складаная і цяжкая барацьба. Невядома было, адкуль і калі чакаць ворага. Патрэбна была пастаянная пільнасьць, уважлівасьць і асьцярожнасьць. Спачатку гэта ня ўсім удавалася. Так, 38 кав. полк, ганяючыся за Махно, спыніўся на начлег і, ня прыняўшы мер для разьведкі і аховы, за гэта моцна паплаціўся—нечакана наляцела банда, захапіла некалькі кулямётаў. Пры сутычцы было забіта некалькі дзесяткаў чырвонаармейцаў і камандзір палка. Гэты выпадак усім і заўсёды трэба памятаць. На вайне ўсюды патрэбна разьведка, ахова і пільнасьць. Пазьней навучыліся біцца і з Махно. Вынучылі абстаноўку і выпадак з 38 кав. палком і жорстка адпомсьціліся Махно. І ўрэшце, пад Мікалаеўкаю, была дашчэнту разьбіта ўся Махноўская армія, захоплена ў палон некалькі сот махноўцаў, яго тэхніка, у тым ліку і нашы кулямёты, і толькі 25-30 махноўцаў выратаваліся і разам са сваім «бацькам» Манхо ўцяклі ў Румынію. За свае баявыя заслугі дывізія ўзнагароджана чырвоным сьцягам.

Канец махноўшчыны быў канцом баявой дзейнасьці дывізіі. Пачалася паласа перадышкі і мірнае вучобы. У мірнай абстаноўцы дывізія ўзмацняе сваю баявую магутнасьць, падкоўвае сябе ў вайсковых і палітычных адносінах, адначасова трымае порах сухім, ведаючы, што перадышка можа ў любы момант скончыцца, бо капіталістыя і нашы заграничныя суседзі рыхтуюць вайну супроць СССР.

За час мірнае вучобы праз дывізію прайшло некалькі ўзростаў чырвонаармейцаў. Дывізія пераварыла іх і падрыхтавала з іх будучых байцоў на фронце, кіраўнікоў вайсковай работы ў вёсцы і актыўных грамадзкіх працаўнікоў і будаўнікоў новае вёскі. Сотні з іх зараз актыўна працуюць у вёсцы, перабудоўваючы яе на сацыялістычных пачатках. Дывізія ўвесь час робіць непасрэдны ўплыў і дапамогу вёсцы.

У апошні пэрыяд дывізія асабліва востра і выразна паставіла перад сабою задачу—рыхтуючы чырвонаармейцаў, будучых барацьбітоў на ваенным фронце, адначасова падрыхтаваць іх, як актыўнейшых байцоў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, як перадавікоў па сацыялістычнай перабудове вёскі. Гэта задача ў асноўным выпрацоўвацца пасьпяхова. У выніку шырокай выхаваўчай работы шырока распаўсюджаны калгасны рух сярод чырвонаармейцаў. Але трэба, аднак паляпшаць і ўзмацняць гэту работу.

Наша дывізія ўвесь час зьвязана з мясцовымі рабочымі арганізацыямі па лініі шэфства і сутаварыства. Рабочыя арганізацыі робяць пралетарскі ўплыў на нашы часьці. Неабходна, аднак, далейшае ўзмацненьне сувязі і пралетарскага ўплыву. Дывізія зьвязана з ангельскай рабочай клясай праз яго авангард—камуністычную партыю, якая шэфствуе над дывізіяй.

Перад дывізіяй зараз стаяць задачы: удасканальваць сваю вайсковую і палітычную падрыхтоўку, усямерна ўзмацняць сваю баявую магутнасьць, узмацняць дысцыпліну, узмацніць клясавае выхаваньне байцоў і клясавае згуртаваньне ў сваіх радох. Трэба ўсямерна разгортваць, у мэтах узмацненьня баявой падрыхтоўкі, сацыялістычнае спаборніцтва, рашуча змагацца з выпадкамі бюракратычных скажэньняў і іншымі нездаровымі зьявамі і настроямі, шырока скарыстоўваючы для гэтага крытыку і самакрытыку і ўзьнімаючы ажыўпасьць партарганізацый. Трэба ўзмацняць ідэалёгічны стан партарганізацый, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, не паспабляючы барацьбы з контр-рэвалюцыйным трацкізмам, адначасова глыбока вывучаць, самым шырокім чынам папулярызаваць і актыўна праводзіць у жыцьцё пастановы 16-й усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Сьвяткуючы 24-26 мая г. г. свой дзесяцігадовы юбілей, дывізія падвядзе вынікі свайму баявому мінуламу, яшчэ раз успомніць і прышчэпіць маладым байцом свае баявыя традыцыі, падагуліць вынік мірнае вучобы і мабілізуе сваю ўвагу на сучасных задачах, што стаяць перад ёю. Наша дывізія з задачамі, што стаяць перад ёю, справіцца. Яна будзе пільна глядзець за ворагам, улічваючы ненадзейнасьць «суседзяў» і сваё прыграничнае становішча і ў выпадку нападу на ворага, выканае свой абавязак да канца, таксама, як яна выконвала гэта ў пэрыяд грамадзянскае вайны. Гарантыяй гэтага зьяўляецца, папершае, наліччa у дывізіі дасканалых кадраў начскладу, у пераважнай большасьці непасрэдных баявых удзельнікаў грамадзянскае вайны, за гады мірнае вучобы грунтоўна ўдасканаліўшых сваю вайскова-палітычную падрыхтоўку, падругое, наліччa тычыльна зьвязаных з чырвонаармейцамі, аўтарытэтных і ў асноўным актыўна-працуючых партыйных і камсамольскіх арганізацый, якія налічваюць у сумме радох 600 камуністых і каля 800 камсамольцаў і, напрэшце, наліччa падкаваных у вайсковых і палітычных адносінах і моцна і сьвядома падтрымліваючых камуністычную партыю і савецкую ўладу чырвонаармейцаў.

Ваенком і начальнік палітаддзелу № кав. дывізіі **Бачараў.**

Прыезд прадстаўніка ЦК ангельскай кампартыі т. Джэксона

Учора у Менск прыехаў тав. ДЖЭКСОН, прадстаўнік ЦК ангельскай кампартыі якая шэфствуе над Самарскай дывізіяй.

Учора-ж тав. Джэксон знаёміўся з бытам і жыцьцём чырвонаармейцаў дывізіі.

Учора пачалося сьвяткаваньне юбілею Самарскай дывізіі

Учора ўвечары па частках Самарскай дывізіі пачалося наладжаньне ўрачыстых сходаў, прысьвечаных юбілею дывізіі. У сходах прымалі ўдзел рабочыя сутаварыскіх арганізацый.

Г у щ о

Рыхтуем будаўнікоў новай вёскі

Сьвяткуючы дзесяцігодзьдзе Самарскай кавалерыйскай дывізіі, трэба адзначыць яе баявыя заслугі ня толькі на франтох грамадзянскае вайны, але і яе заслугі на культурным фронце як непасрэдна ў баявы час, так і ў гады мірнае вучобы. А на фронце культурным дывізія зрабіла таксама шмат. Узяць хоць-бы ліквідацыю няпісьменнасьці. За дзесяць год свайго існаваньня дывізія ліквідавала няпісьменнасьць сярод 4.150 байцоў.

Зараз неяк дзіўна ўспамінаць, калі мы ў пэрыяд гарачых баёў з Дзянікіным, Урангелем, Махно і іншымі белабандытамі, абараняючы Савецкую ўладу, адначасова займаліся вучобаю. А мы і тады ліквідавалі няпісьменнасьць. І тады наш баец, недаядаючы, садзіўся за лемантар і вывучаў яго.

Скончылася грамадзянская вайна. Насталі дні перадышкі, дні мірнае вучобы. Яшчэ мацней мы ўзяліся за яе. Прывялі яе ў больш строгую сыстэму, пачалі байца нашага вучыць і выхоўваць больш грунтоўна і ўсебакова. Вялікая работа нашых партыйных арганізацый, палітскладу і камандзіраў не праходзіць бяз вынікаў, бясьсьледна. Праз усе віды палітасьветработы ў нас у часьцях мы рыхтуем ня толькі байца для абароны дыктатуры пралетарыяту, але і байца-грамадзяніна, актывістага для вёскі, для пераробкі нашае адсталае сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад. За апошнія 3 гады дывізія дала для вёскі больш 1.500 актывістых па розных галінах нашага будаўніцтва: каапэратараў—450 чал., хатнікаў—380, вайсковых працаўнікоў на вёсцы—295, савецкага будаўніцтва—90, калгаснікаў—160, трактарыстых—70 чал., міліцыянэраў—145 чал. і інш.

Уступаючы ў другое дзесяцігодзьдзе існаваньня дывізіі, нам трэба яшчэ больш напружыць свае сілы для таго, каб рыхтаваць яшчэ больш кадр будаўнікоў сацыялізму. Нам трэба практычна выконваць генэральную лінію партыі на калектывізацыю сельскае гаспадаркі, рыхтуючы новыя і новыя кадры калгаснікаў. Будзем поўнасьцю ліквідаваць у нас няпісьменнасьць сярод прыбываючага папаўненьня, яшчэ мацней змагацца за культурнасьць нашага чырвонаармейца і гэтым самым поўнасьцю выканаць задачы партыі, ускладзеныя на Чырвоную армію.

Д. КАЛЕСЬНІКАЎ.



Асада выспы Бірузяк

Толькі трыма шляхамі можна выбрацца з выспы Бірузяк на сухазем'е. Добра ведалі пра гэта белыя. Ведалі яны і тое, што вёрст на 160 па беразе Касьпійскага мора няма чырвоных часьцей.

І вось на выспе Бірузяк засела невялікая часьць чырвоных. Паступова сілы палка вырасьлі—пад'ехала папаўненьне. Ёсьць ужо чатыры эскадроны. ёсьць і пяхота—адна рота кітайцаў Ленінскага палка. Гэта тыя самыя кітайцы, якіх нядаўна эксплёатаваў цар і буржуазія на пабудове Мурманскай чыгункі. Пачалася рэвалюцыя і пралетары-кітайцы сталі ў рады нашай Чырвонай гвардыі. Сфармавалі мы на выспе і батарэю. Знайшліся дзьве кінутыя некалі гарматы. Знайшліся ў нас і артылерыстыя. Паправілі, начысьцілі, знарады ў белых адбілі—батарэя гатова.

Ведалі белагвардзейцы, што мы адны, што нас мала, што харчу ў нас няма, што нам няма куды адступаць—няма ў нас параходаў і баржаў. Ня ведалі яны толькі ад нашай артылерыі, ды аб тым, што байцы нашы патрабавалі «Даеш Кубань», што трусаў сярод нас ня было.

І вось 25 мая, на сьвітаньні на ўсе тры пераправы населі белыя. Полк апынуўся ў асадзе. Выспа Бірузяк—вёрст 15 у даўжыню і вёрст чатыры ў шырыню. З берагу артылерыя белых можа біць на ўсёй выспе.

Генэрал Драценка асаджаў выспу чатырма палкамі коньніцы, ротай пластуноў і дзьвюма батарэямі. Упарта лезьлі белыя. Расказвалі палонныя белагвардзейцы, што іх віном «для сьмеласьці» паіў генэрал. Хоць п'яныя, але толькі-б палезьлі праз ваду на чырвоных. Цяжка прышлося палку. Трое сутак бяз сну, бяз харчу, без адпачынку адбівалі белагвардзейскія атакі на розных вучастках. Думалі ўжо, што ня вытрымаем. На чацьверты дзень нават баржы да выспы для нас «на ўсякі выпадак» падалі. Аднак, не па зубах белых аказаўся чырвоны арэх на Бірузяку. Адбілі ўсе атакі. Ніводнай белагвардзейскай назе не далі ўступіць на выспу байцы 37 кав. палка. Не ўдалася белым асада. Адышлі яны ад выспы на чацьвертыя суткі.

ЗАЙЦАЎ.

Жывыя партрэты байцоў

Пятая кубанская гуляе ў тылу ва Ўрангеля. Дывізія—граза для белых. Белы тыл у паніцы. На чарзе—захват Такмаку. З палкоў дывізіі выклікаюць па 25 ахвотнікаў, задача якіх—ціха вырабіць выбух.

Ахвотнікаў праглынуў вмрок. Чырвонаармеец-партыец Дронаў, рабочы-гарняк—на чале ахвотнікаў. Яго ўвагу прыкоўвае станцыя чыгункі.

Паводьна паўзе паравоз, зьбіраючыся адыйсьці з станцыі. Дронаў кідае пад вагоны бомбу, другую—сам у бок. Застарорыліся вагоны. Гэта і патрэбна было.

А вось чырвонаармеец Піменаў. З бацькай ён разам у Чырвонай армії. Піменаву загадана было адвезьці данясеньне з разьведку ў полк. Дарога дальняя, невнаёмая, Піменаў толькі крыкнуў—«гатоў, ёсьць»!

Галопам у полк. Дарога на лесе.

— Стой!—тупат коняй. Адважны разьведчык кінуўся ў бок, на бугор.

Едуць пяць конных—варожы разьезд. Абрэзы праз плечы вісяць. І Піменаў парашыў раптам напасьці. Няпрыкметна дапусьціўшы іх на блізкую адлегласьць, ён кінуўся на белых з крыкам «ура»!

Піменаў засек трох бандытаў, а 2-х разброеных прывёў у штаб.

ШЧОЛАК.

Як будзе адсьвяткаваны юбілей Самарскай

Сёньня мінае дзесяць год існаваньня №-й Самарскай імя ангельскага пралетарыяту кавалерыйскай дывізіі. Сваё 10-цігодзьдзе дывізія сьвяткуе 24, 25 і 26 мая. Гэтае сьвята не зьяўляецца толькі вузкім сьвятам дывізіі; у ім паўдзельнічаюць непасрэдны і актыўны ўдзел усе арганізацыі працоўных і адзасьцьняя асобы, з якімі дывізія кроўна зрадніла сябе ў пэрыяд грамадзянскай вайны і за мірныя гады абароны сацыялістычнага будаўніцтва.

Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя дывізіі павінна замацаваць тыя баявыя традыцыі, якія заваяваны дывізіяй ў барацьбе за бакінскую нафту, супроць Дзянікіна, за Перакоп супроць Урангеля і супроць многіх іншых ворагаў пралетарскае дзяржавы. Гэта сьвята павінна таксама ўзмацніць сувязь паміж часьцямі дывізіі і шэфствуючымі арганізацыямі.

На сёньня назначаны дывізійны мітынг і дэманстрацыя па горадзе. Акрамя таго, у часьцях арганізуюцца ўрачыстыя абеды. 25 мая адбудзецца дывізійны ўрачысты вечар з дакладам, успамінаў і г. д.

25 і 26 мая праводзяцца конна-спартыўныя і фізкультурныя спаборніцтвы.

Вечары будуць абслугоўвацца масавымі масгацкімі пастаноўкамі.

На сьвята запрашаюцца прадстаўнікі партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, шэфскія і сутаварыскія арганізацыі, а таксама старыя служачыя дывізіі.

У сваё сьвята дывізія яшчэ раз прадэманструе сваю непахістаную волю да абароны сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу і Савецкай Беларусі.

Да чысткі апарату

Падрыхтаваць вылучэнцаў для замены вычышчаных

Пачатак чысткі апарату не павінен нас засьцігнуць раптоўна

ПАКУЛЬ ШТО ПАДРЫХТОЎКА ВЫЛУЧЭНЦАЎ ІДЗЕ ДРЭННА

Вылучэньне ад выпадку да выпадку

Некаторы пералом у справе вылучэньня па нашых прафсаюзах наглядаецца з таго моманту, калі ЦКПСВ зрабіў праверку ў гэтай галіне працы. Гэта было ў першым паўгодзьдзі 1928 году. У кастрычніку 1928 г. пытаньне аб вылучэньні было пастаўлена на пленуме ЦКПСВ, які канстатаваў, што дырэктывы ЦКПСВ большасьцю саюзных арганізацый ня выконваюцца, адсутнічае сыстэматычная падрыхтоўка вылучэнцаў, прафарганізацыі слаба рэагуюць на факты коснасьці і пасыўнага супраціўленьня справе вылучэньня з боку некаторых кіраўнікоў каапэрацыйнага і гаспадарчага апарату, што большасьць прафсаюзаў не разумее неабходнасьці вядзеньня вучоту вылучэнцаў і кандыдатаў да вылучэньня, што прафорганы вылучылі на кіраўнічую работу надзвычайна мала жанчын і моладзі.

Што мы мелі да гэтага пералому? Цяжка сказаць, бо па 11-ці саюзах ня было вучоту. Па 7-мі саюзах было вылучана за пэрыяд ліпень 1927 году—ліпень 1928 году 181 чалавек.

А за пэрыяд ліпень 1928 году—студзень 1929 году вылучана па 18-ці прафсаюзах 441 чалавек. З іх: рабочых—75,4 проц., служачых—24 проц.; мужчын—85,9 проц., жанчын—14,1 проц.; членаў партыі—64 проц., камсамольцаў—3 проц., беспартыйных—31,9 проц.; беларусаў—61,5 проц., яўрэяў—23,3 проц., расійцаў—7,5 проц., палякаў—2,7 проц., іншых—5 проц.

І трэба яшчэ сказаць, што падбор вылучэнцаў быў вельмі добры. Праверка, якая зараз зроблена, паказала, што з усіх вылучэнцаў толькі тры таварышы не спраўляюцца з даручанай ім работай. Іншыя ўсе на месцы. Але роўналежна з гэтым у справе вылучэньня ёсьць рад недахопаў, якія трэба зараз-жа ўважліва ўлічыць. У справе вылучэньня няма пастаяннай сыстэмы. Вылучэньне ва многіх выпадках праводзіцца ўнутры прадпрыемства. Так, па 11-ці саюзах (мэталістых, паперніку, гарбароў, друкароў, харчавікоў, тэкстыльшчыкаў, хімікаў, шэйнікаў, камунальнікаў, парасьветы і нархач) з агульнага ліку вылучаных 93 вылучаны на работу ўнутры прадпрыемства і толькі 76 па-за прадпрыемства. Прычым вылучэньне па-за прадпрыемства, асабліва на акруговую і цэнтральную работу, праводзіцца па меры неабходнасьці, ад выпадку да выпадку.

Калі вылучаюць рабочага на работу ўнутры прадпрыемства, тады яго кандыдатура ў большасьці выпадкаў абгаворваецца на шырокіх сходах рабочых. Так, напрыклад, у саюзе мэталістых з 16-ці вылучэнцаў, кандыдатуры 12-ці абгавораны на вытворчых нарадах, кандыдатуры 2-х—на агульных сходах. У саюзе шэйнікаў з 3-х вылучэнцаў кандыдатуры 2-х абгавораны на вытворчых нарадах. Значна горш абстаіць справа з вылучэньнем на пасады ў нашы ўстановы. Такое вылучэньне праходзіць бяз удзелу мас, у большасьці выпадкаў пасьпяхова, без падрыхтоўкі і разгляду кандыдатур. Так, напрыклад, у Бабруйску ў красавіку гэтага году акруговае прафбюро прапанавала аддзяленьню саюзу нархарч у працягу двух дзён вылучыць кандыдатуру на пасаду дырэктара крухмальнага заводу. Ці можна ў такі кароткі тэрмін падрыхтаваць адпаведнага кандыдата?

Дырэктыва аб стварэньні рэзэрву вылучэнцаў таксама ня выканана. ЦКПСВ да 10-га мая патрабаваў пэрсанальныя сьпісы рэзэрву. І тут выявілася, што з боку цэнтральных праўленьняў і акруговых прафбюро ня прыняты адпаведныя меры для стварэньня рэзэрву.

Чыстка хутка пачнецца. Ці сустрэнуць яе прафсаюзы падрыхтаванымі?

Д.

ПЕРШАЯ НАРАДА ВЫЛУЧЭНЦАЎ НА ФАБРЫЦЫ „ДНЯПРО“

Вылучэнцы скардзяцца на адсутнасьць таварыскай дапамогі

Скліканая па ініцыятыве прадстаўніка цэнтральнага праўленьня саюзу хэмікаў нарада вылучэнцаў фабрыкі «Дняпро» ў Рэчыцы сабрала амаль усіх вылучэнцаў. Прышлі нават тыя, каго вылучылі некалькі год таму назад.

Усе вылучэнцы скардзіліся на тое, што пра іх забыліся. Асабліва скардзіліся на фабком, з боку якога няма ніякага падтрыманьня вылучэнцам.

Вылучэнцы ўнутры фабрыкі, г. зн. загадчыкі аддзяленьняў фабрыкі, гаварылі, што фабком умешваецца ў іх функцыі, падрывае іх работу і перашкаджае правядзеньню патрэбнай гаспадарчай лініі. Фабком ніколі ня ставіў на сваіх пасяджэньнях справаздачу вылучэнца і наогул яго ня цікавіць, добра ці дрэнна працуе вылучэнец.

У яшчэ больш горшым становішчы знаходзяцца вылучэнцы, якія працуюць у гарадзкіх установах.

Здымальшчыца **Кавалеўская**, якая вылучана на пасаду памочніка загадчыка страхагенцтва, расказала наступнае:

— Заработак мой ніжэйшы, чым быў на фабрыцы. **Як працаваць, не паказваюць.** Кожны дзень пытаюць, ці застануся я на гэтай рабоце. Акрамя таго, **я яшчэ лішняя на штаце.** Прашу, каб мяне паслалі зноў на фабрыку, адказваюць—«нязручна». Ні адна арганізацыя ня цікавіцца і ня пытае, як я працую...

Тав. **С. Лічах**—былы ўкладчык, а зараз вылучаны на пасаду нарсьледчага, кажа:

— За 6 месяцаў нічога не паказалі. Прашу мяне інструктаваць, а мне адказваюць—«чорт цябе ведае, што табе сказаць, але мы на цябе спадзяемся, ты хлапец—ня промах». Дык вось, указаньняў не даюць, сам здагадваешся, што трэба зрабіць....

— Пры вылучэньні заўсёды сьпяшаюцца Аб вылучэньні пачынаюць думаць не раней, як за 24 гадзіны да вылучэньня. Часта пры вылучэньні ня лічацца з думкай мас,—кажа **Башко,** вылучаны на пасаду загадчыка хлебапякарняй.

— Пакуль ты працуеш ля варштату, ты ўсім падабаешся, а як вылучылі, дык кожны знаходзіць у цябе розныя недахопы,—кажа **Самончык** аўтаматчык, які вылучаны на пасаду старшыні райвыканкому.

Нарада зрабіла вывады, што ва ўмовах чысткі апарату, што праводзіцца зараз, патрэбен пералом у адносінах да вылучэнцаў з боку партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Усе вылучэнцы ўхвалілі скліканую нараду і выказалі пажаданьне, каб такія нарады склікаліся часьцей. Прынята таксама пастанова аб арганізацыі курсаў па падрыхтоўцы вылучэнцаў, асабліва трэба падрыхтаваць іх па матэматыцы.

МАМЭТ.

У БАРЫСАВЕ НЯ РЫХТУЮЦЬ ВЫЛУЧЭНЦАЎ

Падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату--нездавальняючая

Работа па падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату ў Барысаве праводзіцца амаль што выключна ўпоўнаважаным РСІ і лёгкай кавалерыяй. Кіраўнікі ўстаноў (апрача ЦРК) зусім мала цікавяцца пытаньнямі чысткі, лічачы, што гэта справа ня іх, а РСІ.

Зусім мала ўцягнуты шырокія масы рабочых у справу падрыхтоўкі да чысткі. Мае месца погляд, што «нехта» пачысьціць апарат і можа ён будзе лепшы, а тое, што гэта чыстка павінна прайсьці пры актыўным удзеле шырокіх мас працоўных, гэта не ўсьвядомлена.

Такому становішчу садзейнічае яшчэ тое, што насьценгазэты і друкаваныя фабрычныя газэты (якіх у Барысаве ёсьць тры) надта мала ўдзяляюць увагі пытаньню аб чыстцы апарату. Газэты абмежаваліся тым, што зьмясьцілі адзін афіцыяльны артыкул аб чыстцы і.... усё. Атака на «канкрэтных насіцеляў бюракратычнага зла» не пачалася. У гэтай справе рэкорд пабіла насьценгазэта саюзу камунальнікаў. У той час, як у камгасе апарат вельмі засьмечаны і сярод працаўнікоў пашырана п'янства, сувязь з чужымі элемэнтамі і г. д., насьценгазэта не зьмясьціла ні аднаго слова аб чыстцы апарату, а зьмясьціла толькі вершы:—

«Нам нужно веселиться

И всем Маркса читать...» і г. д.

Насьценгазэце чамусьці трэба весяліцца, а чысьціць апарат ёй ня трэба—на гэта ёсьць РСІ.

Зусім дрэнна пастаўлена справа з падрыхтоўкай новых людзей у якасьці вылучэнцаў у апарат. Амаль што ні адно з прадпрыемстваў ня вылучыла патрэбнага рэзэрву з рабочых. Кіраўнікі савецкіх устаноў—РВК, гарсавету, камгасу і г. д.—не падштурхвалі ў гэтым напрамку, будучы чамусьці заражаны «благодушием»: «У нас няма каго чысьціць і ня трэба замяняць».

На гэтым фоне выдзяляецца, як лепшы, апарат ЦРК, які ўзмоцненым тэмпам пачынае ўсьпадка да чысткі. Праўленьне ЦРК паставіла пытаньне перад усімі прадпрыемствамі аб вылучэньні рабочых для замяшчэньня тых, якія будуць вычышчаны. Для вылучаных былі з'арганізаваны курсы па іх падрыхтоўцы. Гэтымі днямі курсы выпусьцілі ўжо 20 чалавек рабочых, якія ўжо могуць быць скарыстаны на рабоце ў гандлёвым апараце. 2 чалавекі адразу былі ўзяты на працу, а астатнія прымацаваны ў якасьці кіраўнікоў да крамных камісій і ўцягнуты ў іншую грамадзкую каапэрацыйную работу. Праўленьне ЦРК мяркуе пасьлаць рад рабочых у гандлёвыя прадпрыемствы ЦРК на практычную работу, захоўваючы за імі пэнсію. Праўда, гэта павялічыць выдаткі ЦРК, але праўленьне зусім справядліва разважае, што дадатковыя выдаткі добра акупяцца пасьля, калі апарат будзе складацца ня з чужых элемэнтаў, а з лепшых рабочых. У гэтай справе адчуваецца невыстарчальная растлумачальная работа па прадпрыемствах. Рад рабочых, што вылучаюцца на работу ў ЦРК, адмаўляюцца ад гэтай работы.

Прыклад Барысаўскага ЦРК трэба распаўсюдзіць на ўсе ўстановы. Трэба падумаць аб асыгнаваньні патрэбных сродкаў на правядзеньне стажорства рабочых, бяз гэтага надта цяжка будзе запаўняць месцы вычышчаемых рабочых.

Я.

Наш экспартны плян

мы павінны выканаць поўнасьцю

Прыходзіцца канстатаваць, што ў першым паўгодзьдзі г. г. тэмп выкананьня экспартнага пляну ў нас быў некалькі слабы і ён значна адставаў ад заданьня. За паўгодзьдзе агульны разьмер экспарту вывяўся ў суме 7.700.000 руб., што складае 75 проц. выкананьня паўгадовага пляну.

Дзе тут трэба шукаць прычыны? Зразумела, асноўнае гэта тое, што сэзонныя ўмовы ў гэтым годзе, з прычыны цэлага раду абставін ня спрыялі экспартным загатоўкам. Але гэтым не абмяжоўваецца тлумачэньне некаторай няўдачы першага паўгодзьдзя. Многае тут залежала ад нявыразнай работы апарату, ад недахвату ўвагі, якая ўдзялялася экспарту.

Той недахват вывезенага экспартнага лесу, які мы мелі, апрача мэтэаралёгічных умоў (цяжкая, жорсткая зіма), тлумачыцца яшчэ і тым, што лесаэкспартныя арганізацыі (у прыватнасьці Лесбел) ня выкарысталі ў поўнай меры ўсіх магчымасьцяй, мала націскалі на свае апараты, словам, некалькі прамаргалі.

Тыя-ж умовы жорсткай зімы мелі ўплыў на зьмяншэньне выхаду пушнога зьвера і, значыць, на зьмяншэньне загатоўкі пушніны.

Экспарт шчаціны адставаў. Гэта таму, што прадпрыемствы Белшчаціны былі нядосыць загружаны як з прычыны невыстарчальнай загатоўкі шчаціны ў БССР. так і з прычыны недазабесьпячэньня нас сырцом з іншых Рэспублік.

Экспарт-жа смалапрадуктаў затрымліваўся з прычыны няспрыяючай кан'юнктуры на замежным рынку.

У першым паўгодзьдзі зусім не праводзіўся экспарт яек—трэба было забясьпечыць яйкамі мясцовы рынак. І нават з вясны экспарт яек ідзе ня досыць шпаркім тэмпам—загатоўкі яек зьвязаны з труднасьцямі (высокія цэны, рост унутрысялянскага спажываньня яек).

Што датычыць слабога разьвіцьця загатоўкі і экспарту другарадных відаў, дык тут амаль што ўся віна ўскладаецца на арганізацыі, якія не ўдзялялі гэтай справе ніякай увагі. І да гэтага часу ў вёсцы прападае шмат адкідаў і адходаў гаспадаркі. Тое-ж самае мы бачым у горадзе, дзе зусім не утылізуюцца адходы грамадзкіх сталовых, а ў домаўладаньнях і ЖАКТ'ах сярод куч сьмецьця дарма прападаюць адкіды, годныя для экспарту.

Папулярызацыю збору другарадных відаў экспарту трэба прасунуць у людзкую гушчу, у нізавую грамадзкасьць, на вачох у якіх гэтыя прадметы дарма гінуць.

Пытаньні збору другарадных відаў экспарту павінны быць шчыльна пастаўлены перад камсамольскімі арганізацыямі, сельскім настаўніцтвам, вучнямі, каапэрацыйным актывам, сялянскімі камітэтамі ўзаемадапамогі і перад сельскай беднатой.

Пры гэтым зараз ёсьць і матар'яльная зацікаўленасьць: пэўны процант выручкі за сабраныя тавары будзе накіраваны на патрэбы арганізацый (культурныя, агранамічныя і г.д .). Рэшта выручкі пойдзе непасрэдна на карысьць саміх збаршчыкаў.

Да рэчы, трэба адзначыць надавычайна вялую работу акруговых нарад па садзейнічаньні экспарту пры акрвыканкомах—гэтыя нарады не зьвязалі

Бруно Ясенскі

„Я жгу Париж“[1]

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

На пляцы ўсё яшчэ бурліў і хваляваўся натоўп, калі ў дзьвярах ваеннага міністэрства паказаліся першыя цэкістыя. Хтосьці з краю крыкнуў:

— Ідуць!

Тлум прыціхнуў, закалыхаўся, раскалоўся зыгзагам і, праглынуўшы вышаўшых з будынку людзей, зноў замкнуўся. З хвіліну, нібы ваклістыя колы ад кінутага ў ваду каменчыка, калыхаліся вакол гэтага месца чалавечыя галовы. Але зараз-жа праглынутыя людзі выплылі па адным на вырасшых над паверхнаю людзей п'едэсталах. Слоў ня было чуваць, толькі рэзкія ўзмахі рук расьсякалі паветра, нібы дванаццаць ашалелых дырыжэраў уздымалі прымысіць засьпяваць трапяткое шматалосае мора.

З п'едэсталу сымбалічнае дзевы Страсбургу гаварыў хударлявы чалавек, на твары якога буйнымі кроплямі поту асядаў настойлівы лівень воплескаў. Ён казаў:

— На месцы чумы, якая здавалася, павінна была заліць увесь сьвет, а ачысьціла толькі месца для нашае пабудовы, мы распалім вялікую заразу ідэі, і яна морам ачышчальнага полымя разальлецца па старым сьвеце, пасьмяхаючыся над арміямі, межамі, кардонамі. Парыж, які першы паказаў Эўропе першую камуну, першым-жа разьвее яе лад па ўсёй Эўропе.

Натоўп узрушана хваляваўся і бурліў ад шырокіх напеваў «Інтэрнацыяналу». Худалявы мужчына, як корак, падхоплены вірам, сплыў з цокалю на плечы людзей; яго панесьлі кудысьці наперад.

Людзкія хвалі доўга клекагалі ў бухтах тупікоў і пералівах завулкаў.

Каб вырваць іх з гэтага стану нязьмернага захапленьня, да якога натоўп схілен, і перанесьці ў плоскасьць канкрэтнае чыннасьці, трэ' было распароць яго швы, пакроіць ножніцамі арганізацыі адзіную паверхню масы на паасобныя квадраты.

Да паўдню раздробленая і зноў зьнітаваная клеем дысцыпліны маса ўжо ўяўляла сабою здольную дзейнічаць сыстэму сіл.

Першай задачай моманту стала ачышчэньне гораду ад трупаў, якія пачалі ужо загніваць і пагражалі стаць новай крыніцай заразы. Ні аб пахаваньні такое колькасьці цел, ні аб спальваньні іх у цесных, часова зробленых крэматорыях не магло быць гутаркі. Прышлося паліць трупы тут-жа, на вуліцах.

Тры дні на ўсіх вялікіх пляцох Парыжу, падзеленая на атрады, дысцыплінаваная армія з голенымі галовамі людзей раскладала вялізныя вогнішчы з меблі і паперы, на якіх складаліся трупы. На чацьвёрты дзень работа была закончана. Вогнішчы аблілі газаю і бензынаю і запалілі.

Дзень быў надзвычайна ціхі і суседнім будынкам не пагражала ніякая небясьпека. Полымя чорнай сьпіральнай спружынай дыму ўдарыла ў неба, і падпаленае неба, як палаючая саламяная страха, з трэскам паветраных страпіл, рухнула, пакрываючы горад чорнаю калматаю шапкаю.

8-га верасьня газэты усяго сьвету паведамлялі аб пажары Парыжу. На ўзвышшы, на ўзгорку Францыі высыпалі натоўпы французаў глянуць на пажар простым вокам. Вялізныя хмары дыму чорным гэйзэрам білі на сотні мэтраў у неба. Гэта было незабыўнае відовішча.

Адважны францускі лётнік, на ўласную рызыку, хацеў праляцець над палаючым Парыжам, але дзякуючы едкаму дыму, прымушан быў накіравацца назад і нічога ня мог расказаць апрача таго, што Парыж гарыць з ўсіх канцоў.

Сьлюнявая старая бабулька-Эўропа пашкадавала ў гэты дзень няшчасны горад і заплакала сапраўднымі негліцарынавымі сьлязьмі. Пажыльыя паны ўсяго сьвету з прыемнасьцю ўспаміналі маладыя гады свае, «Мулен-Руж», «Максіма», мідынэтак і грызэтак. Папы на абмонах туманна намякалі на кару боскую і заклікалі народ пакаяцца. У палаце дэпутатаў сівы, няўміруючы Брыян вінаваціў камуністых.

На другі дзень прыёмныя радыё-станцыі земнае кулі, пасьля доўтага перапынку, злавілі першую радыё-тэлеграму з Парыжу. Радыё-тэлеграма паведамляла пра пажар, разруху і далейшае нашырэньне эпідэміі.

Падзеі наступных месяцаў, натуральна, на доўгі час адхілілі ўвагу французаў ад іх няшчаснае сталіцы, з якое надыходзілі ўсё такія-ж невясёлыя весткі.

Скарыстаўшы цяжкі стан Францыі, Нямеччына, спасылаючыся на фінансавыя труднасьці, катэгарычна адмовілася далей плаціць па пляне Дауэса. У паветры пахла вайною.

Буржуазныя газэты, на чале з сацыялістымі, заклікалі да акупацыі Бэрліну і раілі прыкончыць з бойкай суседкай. Матросы міжземнаморскага флёту адказалі мяцяжом, вывезіўшы на сваіх параходах чырвоны сьцяг.

Гарнізон Лію, як відаць, спачуваў ім, пратэстуючы на вуліцах разам з дэманстрацыямі рабочых супроць вайны.

Надзвычайнае пасяджэньне Лігі Нацый сьпісала два вагоны канцылярскае паперы, стараючыся як-бы там ні было, вырашыць насьпеўшы канфлікт.

Пад націскам рабочых мас, францускі ўрад прымушан быў пайсьці на ўступкі, парушыўшы дзяводцкую чыстасьць Вэрсальскае згоды. Непасрэдная небясьпека вайны здавалася адхіленай.

Радыё-станцыі Парыжу паведамлялі аб узмацненьні эпідэміі і аб пануючай у заражаным горадзе разрусе. Згодна апошніх вестак, усходнімі кварталамі Парыжу аўладала сэкта анархістых-нігілістых, якія паставілі сваёй мэтай зьнішчыць горад. Тры ўрадовыя летнікі, прабаваўшыя праляцець над Парыжам, былі збіты стрэламі паўстаўных. Тэты інцыдэнт канчаткова зьнішчыў ахвоту ўраду ўмешвацца ў справы зачумленага Парыжу і прымусіў яго прадаставіць горад яго няшчасному лёсу.

Мінулі месяцы. Францыя пакрыце згадзілася са стратай любае сталіцы. Горш гэтай страты ёй прыходзілася перажываць адсутнасьць турыстых з набітымі кішэнямі даляраў, якіх прывабіць назад здавалася асабліва цяжкім.

Трэ' было як мага хутчэй стварыць новую сталіцу, якая ня была-б горшай за старую ў адносінах камфорту і прыемных спакус. Арганізавалася спэцыяльнае акцыянэрнае таварыства для пашырэньня і эксплёатацыі Лію.

Абапал лёнскіх бульвараў маланкава расьлі ўгару камфартабельныя васьміпавярховыя гасьцініцы, адкрываліся тэатры, дансынгі і кабарэ, будаваліся тыкозныя дамы распуты, мужчынскія і жаночыя.

З усіх куткоў Францыі насьпех зьвозіліся гістарычныя каштоўнасьці.

Сэнсацыйную вестку пра новую бліскучую багацьцем сталіцу тэлеграф расструбіў па ўсім сухаземі.

Надзвычайная навіна знайшла гарачы водгук на ўсёй земнай кулі, і кожная з краін сьпяшалася ахвяраваць новай сталіцы свой удавіны грош.

З паслужлівай саюзьніцы Амэрыкі, якая дзеля выгоднае зьдзелкі перамагла нават сполах перад неліквідаванай яшчэ заразай, штодня адпраўлялі ва Францыю вялізныя «Мажэстыкі», нагружаныя ад труму да самай высокай трубы арміямі джаз-бандаў, танцоўшчыць, мэтрдотэляў, сьцюартаў і грумаў. Больш адважныя амэрыканцы рыхтавалі ўжо чамаданы, каб з першымі экскурсіямі Кука першым пастаніць нагу на адваяваным сантымэтры Эўропы.

З усіх краін сьвету па крутых «амэрыканскіх горах» рэек міжнародных чыгуначных кампаній, страціўшы галаву, зьяжджаліся ў Лію зводніцы, какоткі і проста прастытуткі, жывы тавар усіх народаў і рас, для якіх прадугадлівы французкі ўрад прымушан быў пусьціць зьвышнормавыя цягнікі.

Перад вырасшымі дамамі, як грыбы з-пад зямлі, палітай дажджом даляраў, зьявіліся няўміручыя, нязьнішчальныя ўласьнікі мэбляваных пакояў.

Над ўсім горадам стаяў стукат і грукат прыбіваных шыльдаў і рэклям.

Удзень і ўначы з усіх вуліц і завулкаў, вабячы праходжых, нясупынна мільгалі знаёмыя надпісы начных гасьцініц. Вечарам-жа, калі пад шум гавайскага аркестру ў першы раз пасьля доўгае паўзы пачаў сваё вечнае кола нанава адбудаваны ў Лію вятрак «Мулен-Руж», уся Эўропа лягчэй уздыхнула, нібы хацела сказаць: «А ўсё-ж ён круціцца».

Усё змываючым пэрлавым струмэнем па стоках новага Манмартру палілося шампанскае, і з абяцелых вёсак чорнымі істужкамі паплылі на фабрыкі схудалыя абарваныя рабочыя.

Да другое восені сорак шосты чарговы габінэт стабілізаваў франк. Ва Францыі, дзякуючы дрэннай кан'юнктуры, людзі перасталі купляць аўтамабілі. Заводам пагражала закрыцьцё. Усюды напалову скарачаліся штаты. Каб уліцца непраддкаў, звальнялі па некалькі чалавек у розны час і з розных аддзелаў. Аб прыёме новых рабочых не магло быць і гуткарні.

У палаце дэпутатаў сівабароды сацыялісты Поль Банкур гаварыў аб праекце павялічэньня ў два разы кадраў паліцыі.

У адзін прыгожы жнівеньскі вечар, калі па змрочных вуліцах Лію спаваў гэты выпадкова ня сьцраны натоўп статыстых, якіх што вечар выкідаў на экран лёнскіх бульвараў сапсаваны праекцыйны апарат Эўропы, на рагу вуліцы Вів'ен і бульвару Монмартр Жанэта заявіла П'еру, што ёй патрэбны бальныя чаравічкі.

[1]) Гэтым разьдзелам канчаем друкаваць урыўкі з раману «Я жгу Парыж».

НАВУКА і ТЭХНІКА

ІНФРАЧЫРВОНЫЯ ПРАМЕНЬНІ

Як паведамляе нямецкая прэса, спэцыялістыя ангельскага адміралтэйства адкрылі новую старонку ў тактыцы вядзеньня морскага бою, дабіўшыся таго, што караблёў, якія хаваюцца ад праціўніка ў тумане, нельга-бачыць.

Гэта вынаходніцтва, калі яно пацьвердзіцца, можа зрабіць пераварот у морскай тактыцы. У 1919 годзе знайшлі, што ультрафіялетавыя і інфрачырвоныя праменьні, дзякуючы даўжыні сваіх хваль, ня ўспрыймаюцца чалавечым вокам і маюць здольнасьць праходзіць праз туман. Тады-ж узьнікла думка скарыстаць гэтыя праменьні для нябачнай сыгналізацыі.

Справа ў тым, што на вялікіх адлегласьцях, у часе бою, усякія сьцяжкі і пражэктарныя сыгналы, якімі абмеўваюцца караблі аднаго з праціўнікаў, ня могуць быць разгледжаны караблямі другога. Уначы, аднак, акалічнасьці мяняюцца: у цемнаце могуць мець месца баі на блізкіх адлегласьцях. Лёгка зразумець, якое значэньне мае для праціўніка сыгналізацыя пры дапамозе ультрафіялетавых і інфрачырвоных праменьняў. Не дарма ангельцы амаль 10 год пад вялікім сакрэтам вывучалі гэта пытаньне, пакуль не дабіліся ўдалых вынікаў. Апрача скарыстаньня інфрачырвоных праменьняў у нябачнай для праціўніка сыгналізацыі, выявілася яшчэ адна якасьць гэтых праменьняў: яны даюць магчымасьць бачыць у тумане караблі, робяць туман празрыстым. Навуковы супрацоўнік Брытанскага адміралтэйства, фізык Бэрд, вынайшаў спэцыяльны прыбор, які, складаецца з высокапустотных (высока-вакуумных) труб. Прыбор вельмі адчувальны і ўспрыймае самыя слабыя хістаньні адлюстроўваемых праменьняў. Практычна гэта вынаходзіцтва можа быць скарыстана наступным чынам: выпусканыя ў тумане нябачныя інфрачырвоныя праменьні на сваім шляху трапляюць на карабель, які хаваецца ў тумане, і выяўляюць яго. На караблі—адпраўцы, які выпускае праменьні, прыёмны прыбор прымае рэфлектуючыя праменьні і прыводзіць у рух гукавы апарат, які адпаведнай вышынёю тону і сілаю гуку папярэджвае аб знаходжаньні ў тумане карабля. Чым большы карабель, што знаходзіцца ў тумане, тым вышэйшы тон і мацнейшы гук. Гукавы прыёмнік зьдуляецца свайго роду шукальнікам караблёў у тумане. Знайшоўшы яго, прыёмнік перадае свае функцыі больш дакладнаму прыбору, які, дзякуючы цэлай сыстэме лінз, надобна рэнтгенаўскім праменьням на цьмяністым экране, на экране, зробленым з невядомага матар'ялу, дае контуры і абводы карабля, што знаходзіцца ў тумане. Як і кіраўніцтва суднамі на адлегласьці (па радыё), новае вынаходніцтва мае вялікае вайсковае значэньне. Трэба толькі ўдакладніць, пры якіх акалічнасьцях ужываньне інфрачырвоных праменьняў для знаходжаньня караблёў праціўніка будзе найбольш мэтазгодным.

Знаходжаньне караблёў у тумане, зразумела, ня будзе галоўнай задачай новага прыбору. Калі ў бай караблі, для таго, каб затрудніць праціўніку кіраваньне агнём, стараюцца выпусьціць дымавую ці хэмічную заслону, дык, вядома, што яны хаваюцца за гэтай заслонай. Вызначыць іх дакладнае знаходжаньне за заслонаю, і нават пры наяўнасьці найдасканалейшых прыбораў, пры сучасных вялікіх дыстанцыях вядзеньня дымавога морскага бою, немагчыма. Адно накіраваньне на праціўніка ня можа задаволіць кіраўніка агнём. Ён павінен ведаць адлегласьць і месца, дзе падаюць яго знарады. Але гэтых даных пры ўдала пастаўленай заслоне яму ніхто не дае (уключаючы і паветраных карэктыроўшчыкаў).

Важнейшае значэньне гэты прыбор будзе мець у начным баі. Тут ён зробіць бязумоўны пераварот. На моры ў воблачную нахмурую ноч нельга знайсьці праціўніка, бо звычайна ўсе караблі ў ваенны час ходзяць без агню. Праходзячы амаль міма ваеннага карабля ў начной баявой абстаноўцы, вы ня ўбачыце ніводнага, хоць-бы малапрыкметнага праменю сьвятла. У часе сусьветнай вайны з хадзіўшымі без агнёў караблямі здаралася часамі вялікія кур'ёзы. Напрыклад, ноччу, пасьля вядомага Ютланскага бою адзін з ангельскіх крэйсэраў перасек кільватэрную калёну нямецкіх лінейных караблёў і яго ўбачылі на адлегласьці якіх-небудзь ста мэтраў. Нямецкі лінейны крэйсэр «Мольтке», які адстаў ад сваіх лінейных сіл, урэшце, апынуўся сярод ангельскіх галоўных сіл, з якімі ішоў на працягу некалькіх гадзін, пакуль незадоўга да сьвітаньня немцы ўбачылі, з кім яны ішлі ўсю ноч. У той час, як ангельскі крэйсэр па працягу некалькіх хвілін быў зьнішчаны, «Мольтке» ўдалося цішком уцячы ад ангельцаў, якія толькі пасьля высьветлілі, хто з імі ішоў усю ноч. Ясна, што пры наяўнасьці інфрачырвоных праменьняў падобныя выпадкі ня будуць мець месца.

Ня толькі туман, але і цёмная ноч будзе празрытай для карабля, забясьпечанага новай вынаходкай. Ніводзін карабель ня можа схавацца ні ў тумане, ні ў цёмную хмарную ноч.

Гэта вынаходніцтва апрача чыста ваеннага значэньня, можа быць з вялікім посьпехам скарыстана і ў мірны час на суднах гандлёвых флётаў, бо часта ў тумане маюць месца сутычкі паміж суднамі. Зразумела, брытанскае адміралтэйства прасьледуе мэты чыста ваенныя, таму вынаходніцтва ня стане ўласнасьцю сусьветнага гандлёвага флёту, а будзе скарыстана перш за ўсё для патрэб ангельскага ваенна-морскага флёту.

Ф. КЯРТ.

МЕНСК

Аб водпуску цукру

У сувязі з паведамленьнем у друку аб тым, што Наркамгандаль уводзіць вольны продаж цукру па 400 грам на адны рукі па цане 1 р. 20 к. за кілё, намесьнік Наркамгандлю т. Абрамсон зрабіў наступнае растлумачэньне.

— Працоўныя будуць атрымліваць цукар па тэй норме і па тэй-жа цане, (60 к. кілё), па якой яны атрымліваюць зараз. Па гэтай-жа цане (60 к. кілё) у пэрыяд павялічэньня попыту на цукар (чэрвень-ліпень) будзе адпускацца і павялічаная норма цукру для працоўных.

Павялічэньне цэн датычыць выключна цукру, які вызначаны для водпуску той частцы насельніцтва, якая ня мае заборных кніжак. Зусім не забараняецца, зразумела, таму або іншаму працоўнаму пры жаданьні выдаткоўваць цукар вышэй нормы купляць яго па павышаных цэнах на агульных падставах.

Чаму павышаны цэны? Дзяржава зусім не абавязана забясьпечваць непрацоўны элемэнт дэфіцытнымі таварамі выключна па танных цэнах. Ад продажу цукру, каапэрацыя ня толькі нічога не зарабляе, але нават дакладвае. Пры існуючым фінансавым становішчы каапэрацыі мы лічым справядлівым, каб той цукар, які будзе выдавацца непрацоўнаму элемэнту, адпускаўся яму па павышаных цэнах. Вось чаму і ўводзяцца павышаныя цэны.

Як адаб'ецца водпуск цукру на запасах? Тыя фонды цукру, якія мы маем зараз і тая агульная колькасьць цукру, якая вызначана для БССР на 1928-29 г., забясьпечвае бесперабойную дастаўку цукру па тых нормах, якія існуюць. Усяго па павышаных цэнах па БССР будзе адпушчана каля 16 вагонаў цукру, што складае 1 проц. усёй агульнай колькасьці цукру.

Сацыялістычныя спаборніцтвы паміж дражджавымі заводамі

25 мая ў Менску адбудзецца канфэрэнцыя прадстаўнікоў дражджавых заводаў Масквы, Кіева, Менску і Віцебску, на якой будзе падпісаны дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве паміж гэтымі прадпрыемствамі. Харчавікі Менску наладжваюць дэлегатам ад рабочых паказаных гарадоў урачыстае спатканьне.

Агра-культ-фільм „Беларуская Вёска“

Белдзяржкіно выпушчае новы агракульт-фільм «Беларуская Вёска». Здымкі рабіліся ў плямгасе «Калініна» і ў рэдакцыі газэты «Беларуская Вёска». Рэжысэр фільму—Арнольд Пайдзіч. Апаратар—Кальцаты.

Выстаўка кніг у Камвузе імя Леніна БССР

Летні тэатральны сэзон

Дырэктар летніх спэктакляў у памяшканьні БДТ т. Барысаў паведаміў нашаму супрацоўніку.

— Усяго за летні сэзон будзе дана да 70 спэктакляў, якія ў большай частцы будуць пастаўлены для арганізаванага глядача.

Балет Эксперымэнтальнага тэатру, які зараз прыехаў на гастролі ў Менск (пастаноўкі «Чырвонага маку») карыстаецца вялікім посьпехам. Усе пастаноўкі тэатрамі закуплены прафсаюзамі.

31 мая і 1 чэрвеня адбудуцца два спэктаклі в удзелам артыстых Радзіна і Шатровай. З 2-га па 9-га чэрвеня на 7 гастроляй прыяжджае Ленінградскі Рэалістычны тэатр, які вязе з сабой п'есы «Сигнал» Паліванава, «Ветер веет», «Весенние зарницы» і інш.

З 11 па 29 чэрвеня адбудуцца гастролі Ленінградзкага Чырвонага тэатру, які паставіць «Волч'ю тропу», «Пьяный круг», «Ферма» і інш.

26 чэрвеня прыяжджае ансамбль артыстых б. Александрынскага тэатру ў складзе заслужаных артыстых Вів'ен, Ціма, Вольф-Ізраэль, Малюціна і інш. Артыстыя паставяць п'есы «Делец» Ал. Талстога, «Высоты» Лебедзінскага і інш. На 12 спэктакляй прыяжджае Маскоўскі тэатр Пралеткульту, білеты на пастаноўку якога ужо прадаюцца.

За дзень

НАВУКОВАЯ ЭКСПЭДЫЦЫЯ Ў М. СЕМЕЖАВА. Гэтымі днямі ў м. Семежава, Слуцкага раёну, выяжджае навуковая экспэдыцыя з прадстаўнікоў Беларускай Акадэміі Навук, акадэмікаў Некрашэвіча і Лаотоўскага. Мэта экспэдыцыі вывучэньне мовы і этнаграфіі раёну Семежава, бо гэтая мясцовасьць у сэнсе мовы і этнаграфіі мае свае асаблівасьці.

ЭКСКУРСІІ ХАРЧАВІКОЎ. ЦП саюзу харчавікоў накіроўвае 10 чалавек у дальнюю экскурсію (Крым і Каўказ) і 20 чал. у прамысловы цэнтры СССР (Ленінград, Масква, Волхаўбуд).

ПЕРААБСТАЛЯВАНЬНЕ МАГІЛЕЎСКАГА ЗАВОДУ „АДРАДЖЭНЬНЕ“. Магілеўскі мэталюргічны завод «Адраджэньне» пераходзіць пад загад Мэталятрэсту. З зьвязку з гэтым складаецца плян пераабсталяваньня і пашырэньня заводу.

АДПРАЎКА ХВОРЫХ У «САСНОЎКУ». Учора ў санаторы «Сасноўка» была накіравана 4 партыя хворых у складзе 130 чал.

Двухтыднёвік барацьбы з шкоднікамі

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму вядзе падрыхтоўку да двухтыднёвіка барацьбы са шкоднікамі. Савет зьвярнуўся з спэцыяльнаю адозваю да насельніцтва. На вёску высылаецца каля 40 пудоў атрутных матэрый для барацьбы са шкоднікамі. У часе правядзеньня двухтыднёвіка будзе мабілізавана для працы 70 тэхнікаў. І ўвесь аграпэрсанал Наркамзему.

Двухтыднёвік мае распачацца з 26-га мая і ў першую чаргу ён будзе праводзіцца на Мазыршчыне, Бабруйшчыне і Гомельшчыне.

Курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў

Наркамасьветы дагаварыўся з Наркампрацы аб арганізацыі 4-месячных курсаў па падрыхтоўцы настаўнікаў для васьмігадовых школ. На курсы будуць прымацца беспрацоўныя і ў першую чаргу члены саюзу, якія маюць сярэднюю асьвету. Курсы адчыняюцца ў Менску на 100 ч., у Бабруйску—на 100 чал., у Магілеве—100 ч. і ў Гомелі—на 100 ч.

ПАПРАЎКА

У загалоўку артыкулу Лёсіка, які зьмешчаны ва ўчарашнім нумары, прапушчана слова. Напісана «Новае выданьне Б. Тарашкевіча», а трэба: «Новае выданьне граматыкі Б. Тарашкевіча». А таксама ў 2-й калёнцы ў 10 радку зьнізу замест слова «практычна» трэба чытаць «крытычна».

КІНО

„ЧАНГ“ (Сад „Чырвоная Зорка“)

На адчыненьне летняга сэзону ў садзе «Чырвоная Зорка» Белдзяржкіно дада зусім выключны фільм амэрыканскае вытворчасьці—«Чанг». Матар'ялам для фільму паслужыла жыцьцё людзей, „якія ніколі ня бачылі фільму“ і зьвяроў, „якія ніколі ня чулі стрэлу“.

Здымкі адбываліся ў джунглях Паўночнага Сіяму. Дакумантальная частка фільму—звыш усякага чаканьня, бо ўсе здымкі зроблены ў натуральнай абстаноўцы і для людзей і для жывёл.

Фільм не зьяўляецца чыстым відам культурфільму. Гэта і культурфільм, і іграві культурфільм і мастацкі фільм. Сюжэтная пабудова фільму круціцца наўкола тубыльца Кру і яго сям'і. Але сюжэт мала прыкметны, ён расплываецца ў здымках з жыцьця зьвяроў. А тут ёсьць сапраўды надзвычайныя здымкі, як скокі тыграў, леапардаў ды інш. на апарат, бег стадка чангаў (сланёў) і г. д.

Вельмі добрыя кадры з Бімбо, малпаю-гібонам. Гэта—поўнапраўны член сям'і Кру.

У фільме адчуваецца ідэя, хаця яна наўмысьля не падкрэсьлена,—усемагутнасьць чалавека, які пакарае сабе стыхію, і моц гэтага чалавека ў калектыве: толькі калектывам можна змагацца з чангамі, з дзікімі зьвярамі.

Вельмі цікавыя бытавыя моманты, як палываньне на чангаў, аблава, хата на палях, «рольніцтва» і г. д.

Фільм вельмі многа выйграе ад дасканалага мантажу і дасканалае работы апэратараў. Трэба заўважыць, што экспэдыцыя, якая здымала фільм, правяла некалькі год у джунглях.

***

Мусім зазначыць некаторыя загавы саду-кіно. Так экран збудаваны вельмі нізка. Таму ніжняе часткі кадраў і надпісаў ня відаць з-за галоў тых, хто сядзіць у пярэдніх радох. Трэба было-б падняць экран. Таксама трэба было-б зрабіць дах над лавамі, бо дажджы, як сарвалі першы дзень адчыненьня, будуць зрываць і іншыя дні.

Нарэшце, занадта ўжо дарагія білеты—да 45 кап. Меш у кіно-садзе многа, а ўгрыманьне «памяшканьня» каштуе значна менш. Трэба-б кошт білетаў зьменшыць.

В.

Паведамленьні

Ад ЦКК КП(б)Б

У панядзелак, 27-га мая, г. г., а 6 з пал. гадз. ув., адбудзецца пасяджэньне партгрупкі ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая 55, 3 паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў з Менскай арганізацыі:

1) Баранава Міколы Андрэевіча, 2) Храмецкага Пётры Цімафеевіча, 3) Кадушына Мацьвея Міронавіча, 4) Чэбрык-Лютаровіч Ніны Вінцэсеўны, 5) Лазарэвіча Міколы Міхасёва, 6) Гандэвіча Самуіла Юдзелевіча, 7) Вайсмана Міхаіса Эмануілавіча, 8) Якубсона С. Б., 9) Вологі Валер'яна Янкавіча, 10) Яцунаса Паўла Міхайлавіча, 11) Грушэўскага Аляксея Панцялеевіча і 12) Бялага Андрэя Іванавіча.

Паказаныя вышэй таварышы павінны зьявіцца на вызначаны час.

Праезд за свой кошт.

Чл. ПК ЦКК КП(б)Б

(ПОДПІС)

— У пятніцу, 24-V, а 7 г. ув., у памяшканьні агітпропгабінэту адбудзецца нарада кіраўнікоў першага і другога курсу Мен. ВСПШ па пытаньні аб праграме і вучэбным пляне ВСПШ на 1929-30 вучэбны год.

Выклікаюцца: т.т. Амбрасенак, Болатаў, Балотнікаў, Валабрынскі, Вайнштэйн, Ваўчок, Васілевіч, Вайноўі, Дунец, Дварэцкі, Едзядовіч, Кугель, Карпік, Левін, Левіна, Окур, Пасманік, Прусьлін, Рудаміна, Ракаў, Серыкаў, Сьвірноўская, Цыганова, Цырульнік, Чарнецкі, Шапіра.

Яўка ўсіх кіраўнікоў абавязкова.

— У суботу, 25 мая, а 7 г. ув., у Доме Санітарнай Асьветы (пляц Волі, № 23-2), адбудзецца 3 пленум Менскага акруговага камітэту па барацьбе з алкагалізмам.

Яўка ўсіх членаў камітэту, членаў рэвізійнай камісіі і бюро супрацьалкагольных ячэек абавязкова.

У парадку дня: 1) даклад цэнтрасьпірту аб пляне выпуску і разьмеркаваньні хлебнага віна па Беларусі ў 1928-29 г., 2) інфармацыя ўпоўнаважаных антыалкагольных ячэек аб стане працы на мясцох, 3) аб арганізацыі культурнай чайной, 4) бягучыя справы.

— КЛЮБ ІМЯ ІЛЬЛІЧА (МББ ч. таварная). Сёньня, а 7 г. ув.,—канфэрэнцыя чытачоў газэты «Правда» саюзу чыгуначнікаў. Уваход па білетах, разданых праз мясцкомы.

Просьба не пазьніцца.

— БДУ. Сёньня, 24-V, роўна а 6 г. ув., у актавай залі адбудзецца агульны зачынены сход К-ВУ КП(б)Б БДУ.

— ЦБ пралетстуду ЦСПСБ з 20-V г. г. адчыніла завочную кансультацыю па пытаньням прыёму ў навучальныя ўстановы БССР на 1929-30 нав. год.

Па пытаньнях, зьвязаных з прыёмам, неабходна пісьмова зварочвацца па адрасе: г. Менск, пляц Волі, ЦСПСБ—ЦБ пралетстуду.

—Канфэрэнцыя Кастрычнінаўскага райкому МОПР'у распачнецца 25 траўня, а 6 г. ув., у памяшканьні «Дому Селяніна» (Чырвонаармейская вул.).

Пасяджэньне фракцыі а 5 гадз. у памяшканьні райкому МОПР'у.

За мандатамі зьвяртацца ў райком штодзённа ад 7 да 9 г. ув.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Нядзеля, 26 мая.
З прычыны шматлікіх запатрабаваньняў яшчэ раз адкрыты спэктакль
Запяюць верацёны.
Білеты ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. увечары.

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»
Гастролі МАСКОЎСКАГА ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАГА БАЛЕТУ
Пятніца, 24 мая закрыты спэктакль для саюзу Харчавікоў
„Красный мак“
Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Выключны посьпех! Сёньня і штодзённа ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Прэм'ера! Амэрык. баявік. Адна з лепшых карцін сусьветнай кінэматографіі ЧАНГ. Пачатак 1-га сэансу а 9 г. Каса — ад 7 г.

КІНО Інтэрнацыянал — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПЛЁТКА драма ў 7 ч. Пачатак а 7 г.

КІНО Пралетары — Мастацкі фільм ПРАВА на ЖЫЦЬЦЁ Драма ў частках. Зьвыш прагр.—Кіно-хроніка «Савкіно» № 202|23

КІНО Спартак — Амэрыканскі трупа-прыключэнцкі фільм Загадковыя злачынствы у Амэрыцы (ДЭДЭКТЫЎ СЫЦЮАРТ ВЭБС). у 2-х эпізодах—12 частках. 2 эпізоды—12 част. у адзін сэанс. Каса—ад 5 г.

КАЖДОМУ советскому, торговому, кооперативному работнику необходимо быть подписчиком БУХГАЛТЕРСКИХ КУРСОВ НА ДОМУ
заочные курсы бухгалтерии
продолжительность курсов 8 месяцев. Прием производится круглый год. На курсы принимаются лица обоего пола с 16 лет с образованием 4 группы семилетки
По окончании курсов выдаются установленные свидетельства
Плата за первый месяц 5 р., а остальные по 4 р. в месяц, Переводится в начале каждого месяца по адресу: Минск, Всекобанк, текущий счет № 682, а подробные условия высылаются за две десяти копеечные марки
С запросами обращ.: Минск, Всекобанк, ЗАОЧНЫМ КУРСАМ

ЭЛЬВОД
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ДОМАКІРАЎНІЦТВЫ
па Савецкай вул. (ад вул. Сьярдлоўскай да вул. Луначарскага),
„ Ленінскай (ад Савецкай да Пляца Волі),
„ Энгельса (ад Савейкай да Кастрычнікавай),
па Пляцы Волі № 1—3 і дом Працы,
што ў сувязі з закрыцьцём у памянёных мясцох на гэтых вуліцах старай нягоднай магістралі і пераводу вадазабесьпячэньня на новую магістраль,—усе памянёныя домакіраўніцтвы павінны
Ў 2-х ТЫДНЁВЫ ТЭРМІН
перанесьці свае вадаправодныя ўводы да новай магістралі,
аб чым павінны дагаварыцца з Эльводам у працягу 7-мі дзён, пасьля якога тэрміну заяўкі прымацца ня будуць, і калі якія дамакіраўніцтвы не дагаворацца ў паказаны тэрмін, то яны застануцца без вады на ўвесь час.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінск., побач з 2-м Домам Савецтаў, № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутран., хірургічн., жаночыя, зубныя, хваробы вока, нэрвау, хваробы вуха, горла і носа і хваробы скуры.
ФІЗІЯТРЫЧНЫ ГАБІНЭТ кварц, электра і сьвета лячэньне
РЭНТГЕНАЎСКІ ГАБІНЭТ робіць здымкі, прасьвечваньне і лячэньне хворых. Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў.
КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ
Прымаюць па папярэднім запісе
Па хвар. вуха, горла і носа—праф. Бурак па пятніцах ад 3-х гадз.
Па жаночых— —праф. Выдрын па чацьвяргох ад 6 гадз.
Па ўнутраных — —праф. Гаўсман па серадах ад 5 з пал. гадз.
Па нэрвовых — —праф. Кроль па чацьвярох ад 6 гадз.
Па хваробах вока — —праф. Каміньскі па панядзелках і чацьвяргох ад 3—4 гадз.
Па ўнутраных — —праф. Мелніх па чацьвяргох ад 5 з пал. г.
Па хірургічных — —праф. Рубашоў па пятніцах ад 4 гадз.
Па хірургічных — —праф. Сакалоўскі па аўторках ад 5—6 гадз.
Па кішэчна-страўн. — —дацэнт Монасзон па аўторках ад 8 гадз.
Па хваробах скуры — —д-р Розэнталь па суботах ад 12 да 1 з пал. гадз. і па серадах ад 8 г. увч.
Па дзіцячых хвар. — —др Гурэвіч па суботах ад 10 да 12 гадзе.
Па хваробах зубоў і поласьці роту—дацэнт Старобінскі па пятніцах ад 6—7 г. увеч.
Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды
ЭСЕНТУКІ № 20 Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4, „ № 17, „ № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОЎСКАЯ СЛАВЯНАЎСКАЯ | БАРЖОМ з дармовай дастаўкай на дом.
Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.
КАРЫСТАЙЦЕ КАЎКАЗ на ДАМУ!
Замяняйце ўсе напіткі толькі адзіна-карысными каўкаскімі водамі!
Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.
АСЬЦЕРАГАЙЦЕСЯ ПІЦЬ ШТУЧНЫЯ ВОДЫ!

НА ЧЭРВЕНЬ і да канца году — АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ГАЗЭТУ — НА ЧЭРВЕНЬ і да канца году
ЗЬВЯЗДА
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» д